XVIII
5764
30к. 1
12843

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЕ БУДАЎНІЦТВА

СОВЕТСКОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО

ЕЖЕМЕСЯЧНЫЙ
ПОЛИТИКО-ЭКОНОМИЧЕСКИЙ
ЖУРНАЛ

адоз
18603

№ 4
1929
АПРЕЛЬ.

ИЗД. ГОСПЛАНА БССР МИНСК

C
C
Y0007
DS 05
1803

3 ок-1
12843

СОВЕТСКОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО

ЕЖЕМЕСЯЧНЫЙ ПОЛИТИКО-ЭКОНОМИЧЕСКИЙ ЖУРНАЛ ГОСПЛАНА БССР

Ч 0007
аб 05
18603

№ 4

АПРЕЛЬ
1929

ГОД ИЗДАНИЯ 4-й

МИНСК—1929

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

ОТДЕЛ IV.

Библиография.

Ул. **Пракулевіч** Літаратура па эканоміцы і савецкім будаўніцтве БССР 123

Динамика народного хозяйства БССР (статистический бюллетень № 3/20) . 127

Содержание вышедших №№ „Савецкага Будаўніцтва“ за 1929 год 141

Об'явления.

. 123

. 127

. . 141

ОТДЕЛ I.

СОВЕТСКОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО.

ОТДЕЛ I.
СОВЕТСКОЕ
СТРОИТЕЛЬСТВО.

ДЕРЖАВНА ПУБЛІЧНА БІБЛІОТЕКА
"ОДЕСА"
21.ІЮН.29

XVIII
5764

А. Чарвякоў.

Да IX Усебеларускага зьезду саветаў.

VIII зьезд саветаў Беларусі (5—13 красавіка 1927 г.) закончыў працэс фармаваньня Савецкай Беларусі, як часткі Савецкага Саюзу. На гэтым зьезьдзе адбылася: а) афармленьне пастаноў урадаў БССР і РСФСР аб аб'яднаньні ў складзе Беларусі ўсіх тэрыторый з большасьцю беларускага насельніцтва, і, такім чынам, была падведзена база пад далейшае гаспадарчае і нацыянальна-культурнае сацыялістычнае будаўніцтва Беларусі; б) была зацьверджана канстытуцыя Беларусі, чым зьезд аформіў дзяржаўна-праўнае становішча Савецкай Беларусі ў складзе СССР; нарэшцев—) зьездам былі даны дырэктывы аб асновах плянавага будаўніцтва: ў галіне прамысловасьці, сельскай гаспадаркі і народнай асьветы, выходзячы з неабходнасьці скарыстаньня ўсяе матар'яльнай базы аб'яднанай Беларусі і ўцягненьня ў гаспадарча-дзяржаўную культурную працу ўсіх працоўных.

Усё гэта надала VIII зьезду саветаў Беларусі значэньне рубяжу якім закончыўся папярэдня-падрыхтоўчы пэрыод, і ад якога пачаўся новы пэрыод—пэрыод плянавага сацыялістычнага будаўніцтва.

Надзвычайна важнае значэньне для разгортваньня далейшай працы як у Савецкай Беларусі, так і ва ўсім Савецкім Саюзе мае XV зьезд УсеКП(б), які адбыўся ў сьнежні 1927 г. XV зьезд УсеКП(б) дакладна сфармуляваў задачы саветаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва і ў барацьбе супроць капіталізму, а таксама вызначыў шлях далейшай барацьбы за сацыялізм.

На падставе дасягнутых ужо посьпехаў XV зьезд УсеКП(б) адзначыў, што Савецкі Саюз прыступіў і выконвае разгорнутую праграму сацыялістычнага будаўніцтва.

Галоўныя пункты гэтай праграмы: па-першае—задача індустрыялізацыі краіны, пры чым у аснову індустрыялізацыі кладзецца вытварэньне сродкаў вытворчасьці, а таксама сацыялістычная рацыяналізацыя і зьніжэньне сабекошту; па-другое,—узмацненьне плянава-кіруючай ролі сацыялістычнага сэктару народнай гаспадаркі ў адносінах да сельскай гаспадаркі. Тут упяршыню была пастаўлена з усёй рашучасьцю праблема аб аб'яднаньні і пераарганізацыі дробных індывідуальных сялянскіх гаспадарак шляхам іх калектывізацыі. Выкананьне гэтай задачы было пастаўлена ў сувязь з неабходнасьцю далейшага рашучага наступленьня на кулака, апіраючыся на бядняцка-серадняцкія і батрацкія масы вёскі. Нарэшце, трэцяе—гэта пытаньні культурнага будаўніцтва і барацьбы з бюракратызмам. Зьездам было пастаў-

лена пытаньне аб культурнай рэвалюцыі, як неабходнай умове будаўніцтва сацыялістычнай грамады. Зьезд таксама вызначыў, што толькі шляхам уцягненьня ў справу сацыялістычнага будаўніцтва шырачэйшых мас працоўных мы зможам вырашыць пастаўленыя задачы, і што супроць бюракратызму, як злейшага ворага працоўных, які адрывае дзяржаўна-гаспадарчы апарат ад масаў,—трэба весьці самую рашучую барацьбу.

Усе пастановы гэтага зьезду—гэта ёсьць пастановы аб наступленьні сацыялізму і аб далейшай рашучай барацьбе супроць капіталістычных элемэнтаў гораду і вёскі.

Калі мы сёньня падыходзім да неабходнасьці даць ацэнку нашай працы за мінулыя 2 гады пасьля VIII зьезду саветаў БССР, то нам трэба ўлічыць, што зроблена ва ўмовах Савецкай Беларусі дзеля разгортваньня плянавага сацыялістычнага будаўніцтва на падставе дырэктываў XV зьезду УсеКП(б).

Я ня буду спыняцца на лічбовых даных, якія могуць служыць адказам на гэтае запытаньне. Лічу, што кожны чытач часопісу „Савецкае Будаўніцтва“ павінен добра пазнаёміцца з кнігай „Контрольные цифры народного хозяйства и культуры БССР на 1928-29 хоз. год“, у якой ён знойдзе патрэбныя матар'ялы. Я падам толькі тую агульную ацэнку вынікаў нашай працы, што даў XII зьезд КП(б)Б, які адбыўся 5—16 лютага б. г. Там сказана наступнае: „XII зьезд КП(б)Б канстатуе, што ў выніку правільна правадзімай КП(б)Б лініі работы ў поўнай адпаведнасьці з асноўнай палітычнай лініяй і дырэктывам 15 зьезду УсеКП(б) і XI зьезду КП(б)Б мы дабіліся значнага ўздыму ўсяе народнае гаспадаркі Беларусі. У наяўнасьці: значны рост удзельнае вагі прамысловасьці ва ўсёй народнай гаспадарцы пры адначасовым павышэньні ролі буйнай прамысловасьці; уздым сельскай гаспадаркі аднак, ідзе яшчэ яўна невыстарчальным тэмпам; рост калектывізацыі і каапэраваньня сялянскае гаспадаркі; агульнае ўзмацьненьне і рост сацыялістычных элемэнтаў у народнай гаспадарцы пры пасьпяховым наступленьні на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі; няўхільны рост матар'яльнага і культурнага росту рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. У цэлым—умацаваньне дыктатуры пралетарыяту. Усе гэтыя посьпехі былі магчымы, дзякуючы правільнай Ленінскай лініі ў гаспадарчым будаўніцтве, падтрыманьню гэтай лініі з боку рабочае клясы і бядняцка-серадняцкага сялянства“.

Такая ацэнка зроблена на падставе самага ўважлівага вывучэньня ўсіх матар'ялаў, што характарызуюць становішча і працэсы развіцьця нашай гаспадаркі. XII зьезд КП(б)Б улічыў ня толькі посьпехі, ён падрабязгова разглядзеў таксама і нашы цяжкасьці і недахопы ў працы. Ня гледзячы на тое, што гэтыя цяжкасьці і недахопы ў нас ёсьць і часамі прыймаюць досыць гострую форму,—зьезд прызнаў, што мы ў выніку нашай працы маем агульны рост гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі. На падставе гэтай ацэнкі мы павінны з усёй

рашучасьцю адкінуць закіды нашых клясавых ворагаў, быццам Савецкі Саюз у цэлым і Савецкая Беларусь у прыватнасьці папалі ў паласу невырашымых гаспадарча-палітычных цяжкасьцяў, якія арганічна вынікаюць з факту існаваньня савецкай улады. Мы знаем цану такім закідам: яны ставяць сваёй мэтай барацьбу супроць саветаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту.

На падставе гэтай ацэнкі мы павінны весьці рашучую барацьбу супроць хістаньняў і ў нашых шэрагах. Цяжкасьці працы сацыялістычнага будаўніцтва часта выклікаюць хістаньні сярод працоўных і нават сярод паасобных сяброў камуністычнай партыі. Пытаньні аб тэмпе індустрыялізацыі, аб узаемаадносінах і ўдзельнай вазе цяжкай і лёгкай прамысловасьці, аб калектывізацыі, аб наступленьні на кулака— гэта ёсьць тыя пытаньні, вырашэньня якіх патрабуе асаблівай загартаванасьці і таму выклікае хістаньні з боку няўстойлівых элемэнтаў. Для кожнага партыйнага і беспартыйнага працоўнага гораду і вёскі павінна быць ясна, што толькі шлях, вызначаны XV зьездам УсеКП(б), зьяўляецца адзіным правільным і пэўным шляхам да перамогі сацыялізму, да скарэйшага зьнішчэньня беднасьці і някультурнасьці. Хістаньні ў нашых шэрагах паслабляюць нашу сілу. Вось чаму перамога ў барацьбе за сацыялізм, вырашэньне ўсіх задач сацыялістычнага будаўніцтва патрабуюць самай рашучай барацьбы супроць хістаньняў у нашых шэрагах, супроць правага ўхілу і супроць прымірэнцтва з ім.

На падставе гэтай ацэнкі мы можам падыйсьці таксама да вызначэньня задач далейшай працы. Мы жывём сучасным і будучым, а ня мінулым, таму і на нашых зьездах мы заглядаем у мінулае толькі для таго, каб праверыць, як выконваюцца папярэднія дырэктывы, каб праверыць адпаведнасьць гэтых дырэктываў патрэбам жыцьця, каб выкарыстаць вопыт мінулай працы і барацьбы, каб выправіць памылкі і г. д.

Галоўная наша ўвага павінна быць накіравана на тое, каб паставіць перад сабой новыя задачы, каб прысьпяшыць тэмп сацыялістычнага будаўніцтва. IX Усебеларускі зьезд саветаў павінен адыграць важную ролю у гэтым сэнсе. „Пяцігадовы плян разьвіцьця народнай гаспадаркі і культуры БССР"—вось ударнае пытаньне, навакол якога будзе і павінна быць сканцэнтравана ўвага IX зьезду саветаў Беларусі. Гэты плян зложаны па падставе папярэдніх вынікаў сацыялістычнага будаўніцтва Беларусі і з захаваньнем генэральнай лініі XV зьезду УсеКП(б) і XII зьезду КП(б)Б. Гэты плян закладвае моцную падваліну пад сацыялістычную Беларусь. Гэты плян зложаны з улічэньнем вялікай напружанасьці і цяжкасьці, што будуць пры яго выкананьні. XII зьезд КП(б)Б, надаючы надзвычайна важнае значэньне выкананьню пяцігадовага пляну, „заклікае ўсю партарганізацыю мабілізаваць увагу, усю сілу і ўвесь энтузыязм партыі і рабочае клясы на задачах гаспадарчага будаўніцтва". З гэтага відаць, што аднэй з асаблівасьцяў пяцігадовага пляну, які ўносіцца на зацьверджаньне IX Усебеларускага зьезду саветаў, зьяўляецца залежнасьць яго выкананьня ад удзелу ў працы над

выкананьнем самых шырокіх мас працоўных. Нельга, напрыклад, правесьці ў жыцьцё пастановы аб усеагульным навучаньні без самага шырокага ўдзелу ў гэтай працы масы ўсяе савецкай грамадзкасьці. Таксама мерапрыемствы па ўзьняцьці ўраджайнасьці і перабудове сельскай гаспадаркі патрабуюць масавасьці. Рацыяналізацыя прамысловасьці, узняцьце вытворчасьці працы, зьніжэньне сабекашту—усё гэта патрабуе ўдзелу мас. Барацьба супроць шкодніцтва, зьнішчэньне бюракратызму і г. д. таксама патрабуюць удзелу ўсяе масы працоўных. IX Усебеларускі зьезд саветаў павінен уважліва разглядзець і зацьвердзіць пяцігадовы плян як падваліну сацыялістычнай Беларусі, а таксама прыняць усе меры да яго выкананьня. Галоўнай з гэтых мер, як відаць з вышэйсказанага, зьяўляецца мабілізацыя ўвагі ўсіх працоўных навакол выкананьня намечанага пляну, самая шырокая папулярызацыя пляну ў масах працоўных. Пасьля IX зьезду саветаў пяцігадовы плян разьвіцьця народнае гаспадаркі культуры БССР павінен стаць настольнай кнігай кожнага граматнага грамадзяніна Беларусі, аб гэтым пляне павінны ведаць усе працоўныя. Сьвядомы ўдзел працоўных у выкананьні гэтага пляну будзе найлепшым паказальнікам, што працоўныя масы Беларусі бадзёра ідуць уперад пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, і што хістаньняў у нашых шэрагах няма і ім не павінна быць месца.

Нас кліча будучына, і IX зьезд павінен працаваць з упэўненасьцю у перамогу сацыялізму і з энтузыязмам пераможнікаў заклікаць на барацьбу за будучыну, за сацыялізм.

А. Хацкевіч.

Вынікі перавыбараў і галоўнейшыя задачы саветаў на вёсцы.

Удзел працоўных мас у савецкім будаўніцтве, у кіраваньні дзяржавай, у рэканструкцыі народнае гаспадаркі і разьвіцьці савецкай культуры асабліва яскрава выяўляецца пры перавыбарах саветаў. Вось чаму выбары ў саветы зьяўляюцца сапраўдным экзамінам праўдзівай актыўнасьці працоўнага насельніцтва, сродкам яшчэ большай падрыхтоўкі саветаў да творчай працы па сацыялістычным будаўніцтве. Гэты экзамін саветы Беларусі пры апошніх перавыбарах поўнасьцю вытрымалі.

Выбары ў сельскія саветы пачаліся па ўсёй БССР з 1 студзеня 1929 году і працягваліся паўтара месяцы. Гэтая кампанія выбараў праходзіла ва ўмовах нячуванага абвастрэньня клясавай барацьбы. Кулак праявіў выключную актыўнасьць і месцамі вялікую ўмелую падрыхтаванасьць да выбарчай кампаніі. Кулак сваімі паводзінамі на перавыбарах саветаў сам даказаў, што палітыка партыі ў вёсцы б'е прама ў цэль. Яшчэ выразней, яшчэ больш гэтае даказалі батракі і вясковая беднота, якія ў саюзе з серадняком далі рашучы адпор кулаку і нэпману. Мэрапрыемствы партыі і савецкай улады, накіраваныя на падняцьце ўраджайнасьці, пераход на шматпольле, да калектыўных форм землякарыстаньня, арганізацыю машынных таварыстваў, малочных арцеляў і г. д. узьнімаюць палітычна і эканамічна бедняка і серадняка,—сьмярцельна б'юць па кулаку, адымаюць у яго апошнія сілы. Выбарчая кампанія прыцягнула да ўсіх пытаньняў сацыялістычнага будаўніцтва ўвагу шырокіх слаёў рабочых і сялян—усяго працоўнага насельніцтва.

Актыўнасьць вясковага насельніцтва ў гэтым годзе, у параўнаньні з выбарчай кампаніяй 1927 году, паднялася на 12 проц.– з 46,9 проц. да 58,9 проц,; актыўнасьць жанчын з 26,4 проц. павялічылася да 42,8 проц. У сельскія саветы абрана: камуністых—8,9 проц., камсамольцаў—8,6 проц. Тут, аднак, трэба адзначыць, што хаця процант абраных камуністых некалькі панізіўся ў параўнаньні з мінулай выбарчай кампаніяй, але фактычна колькасьць і камуністых і камсамольцаў у складзе сельскіх саветаў амаль што падвоілася, так як у Беларусі ў гэтым годзе ў сельскія і местачковыя саветы абіралі аднага дэпутата ад 100 чал. насельніцтва, а не ад 200, як гэта было раней. Жанчын абрана ў саветы Беларусі 19,7 проц., г. зн. больш, чым у мінулую кампанію, на 12,5 проц. У складзе старшынь сельскіх саветаў жанчыны займаюць 7,6 проц. замест 0,8 проц. 1927 г. і ў складзе членаў прэзыдыумаў—14,7 проц. замест 3,6 проц. мінулых выбараў. Па сацыяльным становішчы ўноў абраныя сельскія саветы характарызуюцца гэтак: сялян абрана 91 проц., рабочых і батракоў—4,4 проц., беднаты, аслабанёнай ад сельска-гаспадарчага падатку—39,4 проц. (замест 22,8 проц.) і сялян, якія плацяць сельска-гаспадарчы падатак у разьмеры да 10 руб. на душу—59,9 проц., што складаюць сераднякі. Мы маем значнае павялічэньне процанту камуністых, камсамольцаў, рабочых, батракоў і беднякоў у складзе старшынь, сакратароў і прэзыдыумаў новых сельских саветаў.

У гэтую выбарчую кампанію партыя выступіла перад выбаршчыкамі з шырокай праграмай сацыялістычнага будаўніцтва. З усёй выразнасьцю

былі пастаўлены задачы індустрыялізацыі краіны, каапэраваньня і калектывізацыі сельскае гаспадаркі, далейшага наступу на капіталістычныя элемэнты гораду і вёскі, палепшаньня дзяржаўнага апарату, узмацненьня саюзу рабочае клясы з сялянствам пад кіраўніцтвам пралетарыяту. Гэтыя задачы, высунутыя партыяй, знайшлі поўнае падтрыманьне як з боку пралетарыяту, гэтак і з боку асноўнай масы сялянства, а таксама практычны выраз у наказах дэпутатам і выбарах, у выніку якіх працоўныя паслалі ў саветы лепшых сваіх прадстаўнікоў, якія забясьпечаць сваёй працай правільнае вырашэньне пастаўленых перад саветамі задач. І пасьля перавыбараў саветаў, галоўнейшай задачай ёсьць ажыўленьне масавай і практычнай дзейнасьці саміх саветаў з максымальным уцягненьнем у савецкую работу актыву. Партыя не паслабіць працы сярод беднаты, па ажыўленьні працы груп беднаты ў саветах, як сродку, які забясьпечыць за беднатой рашаючы ўплыў у справе правільнага ажыцьцяўленьня палітычнай лініі партыі і савецкай улады ў вёсцы.

Якое эканамічнае становішча гораду і вёскі мы мелі да Кастрычніцкавай рэвалюцыі і ў сучасны момант?

У дарэвалюцыйны час Беларусь па характару свае народнае гаспадаркі была пераважна сельска-гаспадарчай краінай. Прамысловасьць Беларусі была ў зачаткавых формах і належыла ў сваёй масе да тыпу дробнай саматужнай і паў-саматужнай прамысловасьці. Толькі ў некаторых галінах прамысловасьць Беларусі насіла фабрычна-заводзкі характар. Удзельная вага прамысловасьці ў адносінах прадукцыі сельскае гаспадаркі дасягала ня больш 8-9 проц. Сельская гаспадарка стаяла на вельмі нізкай ступені разьвіцьця і характарызавалася трохполкаю, дзе-ні-дзе перакладанай сыстэмай, сахой і нізкай валавой прадукцыяй. З гэтакай слабай эканомікай Беларусь сустрэла Кастрычнікавую рэвалюцыю і перажыла на сваіх палёх у вёсках, мястэчках і гарадох акупацыі—нямецкую і польскую і контр-рэвалюцыйны бандытызм. Ваенныя акупацыі і бандытызм расхісталі і зруйнавалі і бяз гэтага слабую гаспадарку Беларусі. Але, пачынаючы з 1922-1923 году саветы Беларусі змаглі ўжо прыступіць у параўнальна спакойнай абстаноўцы да мірнага і творчага савецкага будаўніцтва, да рэканструкцыі гаспадаркі і разьвіцьця культуры. Да гэтага часу, г. зн. за параўнаўча кароткі пэрыод мірнай, адбудоўчай працы ў Беларусі ўжо маюцца вялізарныя посьпехі. Гэтыя дасягненьні XII зьезд КП (б)Б ахарактарызаваў так: „З надзвычайна адсталага ў эканамічных і культурных адносінах, нацыянальна-прыгнечанага, з абвостранымі ўнутры міжнацыянальнымі адносінамі раёну пры царызме, БССР зьмянілася ў магутную краіну, якая расьце шпаркім тэмпам, у якой расьце ўдзельная вага прамысловасьці, будуецца Асінбуд, расьце і сацыялістычна рэканструецца сельская гаспадарка, шпарка і пасьпяхова разьвіваецца нацыянальная культура і ўстаноўлены правільныя міжнацыянальныя адносіны... Як у прамысловасьці, гэтак і ў сельскай гаспадарцы БССР за мінулы пэрыод ня толькій скончан працэс аднаўленьня, але фактычна пачаліся і пасьпяхова разьвіваюцца працэсы глыбокай сацыялістычнай рэканструкцыі“.

Якія маюцца галоўнейшыя дасягненьні хаця-б у сельскай гаспадарцы Беларусі? Пасяўная плошча значна перавысіла даваенны ўзровень, павялічыўся пасеў тэхнічных і працаёмкіх культур, падвышаецца ўраджайнасьць, палепшылася гадоўля жывёлы, павялічылася колькасьць прадукцыі, зьмяніліся ў лепшы бок мэтады апрацоўкі зямлі, усё больш і больш павялічваецца пераход ад трохполкі да шматпольля, разьвіваюцца аграмаджаныя формы земляробства. Вось тыя асноўныя посьпехі, якія пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі мае Беларусь на гаспадарчым фронце ў вёсцы.

Мы можам рашуча заявіць, што нашы посьпехі ёсьць вынік правільнай палітыкі партыі і савецкай улады, узрастаючай самадзейнасьці рабочае клясы, а таксама бядняцкага і серадняцкага сялянства, якое ідзе за рабочай клясай, на падставе дыктатуры пралетарыяту. Пачынаючы з 1925 году, калі быў агалошан лёзунг „ажыўленьня саветаў", працоўныя масы Савецкай Беларусі сыстэматычна і няўхільна ўцягваюцца ў практычную работу саветаў і выканаўчых камітэтаў. Усе намаганьні партыі і савецкай улады накіраваны да таго, каб у савецкім і грамадзкім будаўніцтве абавязкова прымалі ўдзел усе рабочыя, усе бядняцка-серадняцкія масы сялянства, па магчымасьці ўсе працоўныя. Дасягненьні ў справе падняцьця самадзейнасьці і актыўнасьці працоўных зьяўляюцца заставай ажыўленьня саветаў, гарантыяй посьпехаў у справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Пасьпяховае і правільнае вырашэньне пастаўленых перад саветамі задач можа быць забясьпечана толькі актыўнай масавай працай саветаў. Восеньню мінулага году Цэнтральны Выканаўчы Камітэт БССР на чарговай сэсіі па дакладу аб масавай рабоце саветаў адзначыў, што масавая работа сельскіх і местачковых саветаў і раённых выканаўчых камітэтаў, ня гледзячы на агульнае яе палепшаньне яшчэ ня вырашае цалкам задач, якія стаяць перад саветамі. Усё ўзрастаючая актыўнасьць рабочых, батракоў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі і мястэчка слаба выкарыстоўваецца саветамі для разгортваньня масавай работы саветаў. Адначасова з дырэктывай ажыўленьня дзейнасьці нізавых саветаў сэсія прапанавала сканцэнтраваць іх масавую работу на асноўных пытаньнях сацыялістычнага будаўніцтва—на калектывізацыі і інтэнсыфікацыі сельскае гаспадаркі, культурным будаўніцтве, гаспадарчым упарадкаваньні мястэчак. Сэсія дала дырэктыву саветам разьвіваць і рашуча падтрымліваць ініцыятыву сялянства ў справе пераходу да каляктыўных форм землякарыстаньня. Саветам прапанавана ўсе важнейшыя гаспадарчыя пытаньні і пытаньні культуры разглядаць пасьля масавай дакладнай папярэдняй прапрацоўкі іх у камісіях.

Асноўнымі формамі масавай работы ў вёсцы зьяўляюцца пленумы сельскіх саветаў, іх камісіі і сельскія сходы. Саветамі сельскія сходы павінны быць выкарыстаны як формы шырокага прыцягненьня бядняцка-серадняцкіх мас у справу гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вёскі. Вось чаму ўсе пытаньні шырокага грамадзкага значэньня прэзыдыумы сельскіх саветаў, пасьля сваёй папярэдняй прапрацоўкі, павінны ставіць на абгаварэньне сельскіх сходаў перад канчатковым вырашэньнем гэтых пытаньняў на пленумах саветаў. Зразумела, што камісіі пры сельскіх саветах ахапляюць меншае кола сялянства, чым сельскія сходы, але яны зьяўляюцца сродкам найбольш грунтоўнага і сыстэматычнага ўцягненьня актыву працоўных мас у савецкае будаўніцтва. Камісіі і сэкцыі саветаў вучаць на справе радавога рабочага і селяніна, работніцу і сялянку, як кіраваць дзяржаваю і выяўляюць той савецкі актыў, які і павінен паступова высоўвацца на адказную савецкую і грамадзкую працу. Дзеля гэтага выключная ўвага павінна зварочвацца ажыўленьню дзейнасьці сэкцый гарсаветаў і камісій сельсаветаў.

У зьвязку з пастаўленымі задачамі аб перабудове вёскі набываюць асабліва важнае значэньне сельска-гаспадарчыя камісіі. У іх склад павінны быць уведзены лепшыя працаўнікі саветаў, члены калектыўных гаспадарак, працаўнікі саўгасаў, індывідуальныя гаспадары беднякі і сераднякі, якія культурна вядуць сваю гаспадарку і імкнуцца да аграмаджаньня сваіх гаспадарак. Работа сельска-гаспадарчых камісій павінна быць пабудавана чотка і сыстэматычна па прыкладу работы вытворчых нарад у прамысловых прадпрыемствах.

Зразумела, што ажыўленьне дзейнасьці нізавых саветаў яшчэ цалкам не забясьпечыць сацыялістычнай перабудовы вёскі. Вёсцы неабходна дапамога ў вырашэньні гаспадарчых і культурных задач з боку гарадзкога пралетарыяту. Дзеля гэтага трэба ўсямерна ўмацаваць сувязь асноўнай масы сялянства з рабочаю клясаю. Тут неабходна рашучае ўзмацненьне дзейнасьці шэфскіх арганізацый, трэба зьмяніць мэтады працы апошніх, зьнішчыўшы нарасьль казёншчыны. Шэфскія арганізацыі ў справе сацыялістычнай перабудовы вёскі павінны аказваць сыстэматычную і бязупынную дапамогу. У некаторых мясцох ужо пачалі арганізоўвацца спэцыяльныя рабочыя вобчаствы па падняцьці ўраджайнасьці. Гэтыя арганізацыі трэба ўвязаць з шэфскімі арганізацыямі і сельсаветамі. Іх трэба падтрымліваць і арганізоўваць яшчэ новыя вобчаствы, як, напрыклад, па садзейнічаньні калектывізацыі земляробства і інш.

Удалы вопыт пасылкі рабочых брыгад у вёску ў час перавыбараў саветаў не забываць і не пакідаць, а ўвесьці ў сыстэму змычкі гораду з вёскай. Гэтая мера, высунутая партыяй і рабочымі, аказала і акажа ў справе ўзмацненьня бядняцка-серадняцкага блёку, у яго барацьбе з кулацтвам, рашаючы ўплыў.

Бліжэйшыя чарговыя задачы, якія стаяць перад саветамі ў вёсцы, вынікаюць з агульных задач сацыялістычнага будаўніцтва і канкрэтных рашэньняў XII зьезду Камуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі. У сельскай гаспадарцы маюцца значныя дасягненьні, гэта бязумоўна, але гэтыя дасягненьні зьяўляюцца толькі першымі крокамі агульнага ўздыму і перабудовы сельскае гаспадаркі на новых тэхнічных пачатках. Мы ведаем, што толькі калектывізацыя і сацыялістычная рэканструкцыя можуць рашуча падняць сельскую гаспадарку на неабходную вышыню. Дзеля гэтага, бліжэйшай непасрэднай задачай саветаў зьяўляецца ўзмацненьне тэмпу калектывізацыі сельскае гаспадаркі вёскі і стымуляваньня росту індывідуальных бядняцко-серадняцкіх гаспадарак, утвараючы ўмовы да пераходу іх на калектыўныя формы землякарыстаньня. Пры гэтым саветы павінны з усёй рашучасьцю праводзіць у жыцьцё мерапрыемствы па падняцьці ўраджайнасьці, машынізацыі, з канчатковай заменай сахі плугам і трактарам, па каапэраваньні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, усямерна разьвіваючы агрыкультурную дапамогу бядняцка-серадняцкаму сялянству вёскі.

Побач з задачамі гаспадарчага будаўніцтва вёскі, перад саветамі Беларусі ў галіне культурнага будаўніцтва стаіць задача па далейшым няўхільным разгортваньні школьнай сеткі да поўнага абслугоўваньня ў самы бліжэйшы час школамі дзяцей батракоў, сялянскай беднаты і серадняцтва. Узмацніць палітыка-асьветную работу па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй ёсьць бліжэйшая задача ўсіх партарганізацый і саветаў.

У галіне разьвіцьця сацыялістычнага наступу на капіталістычныя элемэнты, неабходна яшчэ больш узмацніць саюз батрацтва і беднаты з серадняком, аказваючы ўсямерную эканамічную і культурную дапамогу ў галіне гаспадарчага ўпарадкаваньня беднаты. Работа сярод батрачак і сялянак павінна быць узмоцнена і палепшана; неабходна абраных у саветы лепшых актыўных батрачак і бяднячак сялянак высоўваць на сталую кіраўнічую працу ва ўсіх галінах нашага будаўніцтва, аказваючы ўсямерную дамамогу пашырэньню сеткі ўстаноў па бытавому праўдзіваму разняволеньню працоўных жанчын.

Па пяцігадовым пляне разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры Савецкай Беларусі прадугледжваецца падняцьце ўраджайнасьці зернавых культур на 45 проц.; падняцьце ўраджайнасьці ў савецкіх гаспадарках—на 70 проц. і калектыўных—на 60 проц.; павялічэньне пасяўной плошчы

прадугледжваецца на 15 проц.; засеў чыстасартавым насеньнем павінен быць даведзены да 100 проц.; саха ўсюды павінна быць заменена плугам і трактарам; павінны быць пабудаваны раённыя і шэраг сельскіх і гарадзкіх электрастанцый; на працягу бліжэйшых пяці год у Беларусі павінна быць поўнасьцю зьдзейсьнена ўсеагульная народная асьвета.

Усе гэтыя задачы павінны ўвайсьці ў плян канкрэтнай работы новых саветаў і пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый сваечасова вырашацца і праводзіцца ў жыцьцё.

Неабходна спэцыяльна і больш падрабязна застанавіцца на пытаньнях калектывізацыі сельскае гаспадаркі, як галоўнейшай задачы сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы, пастаўленай партыяй перад саветамі і ўсімі грамадзкімі арганізацыямі.

Перабудаваньне сельскае гаспадаркі на сацыялістычных падставах і сапраўдны ўздым эканамічнага і культурнага дабрабыту бядняцка-серадняцкіх мас сялянства магчымы толькі пры ўмовах пераходу дробных і драбнейшых індывідуальных сялянскіх гаспадарках да буйнага іх аб'яднаньня. Вось чаму пятнаццаты зьезд УсеКП паставіў задачу калектывізацыі і каапэраваньня сельскае гаспадаркі, як галоўную задачу нашай працы на вёсцы.

На працягу ўсяго часу ад пятнаццатага партзьезду, партыя і савецкая ўлада рашуча праводзілі практычныя мерапрыемствы ў напрамку калектывізацыі, як вышэйшай формы землякарыстаньня, маючы ў гэтым вялізарныя посьпехі і дасягненьні. Бяднейшае сялянства вёскі, пад кіраўніцтвам партыі, усё больш сьмялей становіцца на шлях калектывізацыі, як правільны шлях, які вядзе і прывядзе вёску да сацыялізму.

Немажлівасьць скарыстаньня ўсяго лішку рабочых рук вёскі гарадзкой прамысловасьцю, прысутнасьць у вёсцы значных колаў маламоцнага сялянства, якое ні ў якім разе ня можа індывідуальным парадкам палепшыць сваю гаспадарку, масавае імкненьне беднаты і серадняцтва вёскі гаспадарча ўмацавацца і вызваліць сябе ад эксплёатацыі кулака і нэпмана— усё гэта стварае неабходнасьць з боку саветаў і выканаўчых камітэтаў самых уважлівых адносін да справы калектывізацыі сельскае гаспадаркі, рашучай усямернай, штодзённай дапамогі калектывам у іх цяжкай будаўнічай працы. Вопыт жа мінулага часу ў калгасным будаўніцтве паказаў, што ў гэтым будаўніцтве саветы не зьяўляюцца непасрэднымі ўдзельнікамі арганізацыі гаспадарчых калектываў. Арганізацыя калгасаў цяпер, як і раней, у значнай ступені ідзе стыхійна, і таму паасобныя калектывы будуюцца не на здаровых арганізацыйна-гаспадарчых падставах, а часта з мэтай атрыманьня крэдыту на свае ўласныя гаспадарчыя патрэбы. Зразумела, што гэткія калектывы няжыцьцёвы і хутка развальваюцца, кампраметуючы ў вачох насельніцтва самую ідэю калектывізацыі.

Члены ўраду, якія былі са справаздачамі ўраду на раённых зьездах саветаў Беларусі, на спэцыяльнай нарадзе адзначалі, што на мясцох няма дастатковага ўмелага падыходу да справы калгаснага будаўніцтва. Часта бывае, калі сельсаветы і нізавыя каапэрацыйныя органы ня толькі ня вядуць ніякай арганізацыйнай і растлумачальнай працы па калектывізацыі, а нават ня маюць у сябе статутаў для арганізацыі калгасаў па ініцыятыве самога бядняцка-серадняцкага насельніцтва вёскі. На гэтай глебе ствараласа шмат непаразуменьняў і валакіты, бо адсутнічаньне статуту не давала магчымасьці аформіць калектыў. Наглядаецца шмат выпадкаў фармалізму і валакіты з боку саветаў, каапэрацыйных і зямельных органаў пры рэгістрацыі і юрыдычным афармленьні статутаў. У пытаньні рэгуляваньня сацыяльнага складу калгасаў таксама наглядалася блытаніна; былі выпадкі,

калі сераднякі выключаліся са складу калгасу, а таксама і такія факты, калі кулак, гандляр залічаліся ў сябры калгасу. Можна прама сказаць, што саветы, а таксама нізавыя зямельныя і каапэрацыйныя органы ня маюць сталых плянаў калектывізацыі сельскіх гаспадарак сваіх раёнаў; ня маюць неабходнага нагляду за правільным скарыстаньнем калгасамі сельска-гаспадарчага крэдыту, чаму нярэдка бываюць выпадкі, калі атрыманыя калгасамі крэдыты скарыстоўваліся на патрэбы індывідуальных гаспадарак сяброў калгасаў. Зразумела, што ўсе гэтыя ненармальныя зьявішчы перашкаджаюць шырокаму разгортваньню калгаснага будаўніцтва на здаровых сацыялістычных падставах. Ясна, што органам сельска-гаспадарчай каапэрацыі, без дапамогі саветаў, з усімі адзначанымі ненармальнасьцямі ня справіцца.

Падняцьце сельскае гаспадаркі, уздым ураджайнасьці, калектывізацыя і каапэраваньне вёскі патрабуюць ад саветаў і выканкомаў вялізарнейшай напружанай працы.

Значэньне калкетывізацыі ў справе сацыялістычнага перабудаваньня сельскае гаспадаркі, яе роля ў арганізацыі вясковай беднаты і наогул у справе палепшаньня дабрабыту вёскі, дыктуюць неабходнасьць усямернага і сапраўднага падтрыманьня гэтага руху з боку дзяржавы ў асобе саветаў і выканкомаў, як органаў дыктатуры пралетарыяту. Перш за ўсё з боку саветаў трэба павесьці рашучую барацьбу са спробамі паасобных кулацкіх і нэпманскіх элемэнтаў арганізоўваць і скарыстоўваць фальшывакалектыўныя гаспадаркі ў сваіх асабістых мэтах; усямерна дапамагаць у справе арганізацыі калектываў з батракоў, беднаты і серадняцкага сялянства вёскі, сапраўды жадаючых перабудаваць гаспадарку на правільных калектыўных працоўных падставах.

Дабівацца льготных умоў куплі машын толькі тым машынным таварыствам, якія скадаюцца з бядняцкіх і серадняцкіх жыхароў вёскі. Саветы павінны дапамагаць адпаведным органам, якія арганізоўваюць калектывы і таварыствы, не дапушчаць у органы кіраўніцтва гэтых арганізацый і ў лік устаноўшчыкаў тых асоб, якія пазбаўлены права выбараў у саветы.

Пастановы Саюзнага і Беларускага Ураду аб дармовай перадачы калектыўным гаспадаркам прамысловых і дапаможных прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на тэрыторыі калгасаў, павіны быць цалкам выкананы, бо гэта ёсьць адна з галоўнейшых мер гаспадарчага замацаваньня калгасу.

Калектывізацыі, каапэраваньню сельскай гаспадаркі наогул трэба дапамагаць па ўсіх галінах усяе савецкае і гаспадарчае сыстэмы зьверху да нізу. Напрыклад, важнейшае значэньне маюць гаспадарчыя будоўлі агульнага карыстаньня ў справе калектывізацыі, якія цягнуць за сабою пашырэньне і паглыбленьне агульных аграмаджаных сродкаў вытворчасьці, машын, жывёлы, запасаў і г. д. Калектыўныя будынкі пашыраюць і паглыбляюць грамадзкі пачатак у быт, уздымаюць культурны ўзровень і замацоўваюць сталае калектыўнае вядзеньне гаспадаркі.

Савецкія органы на мясцох, у сэнсе дапамогі калектывам будаваць калектыўныя жыльлёвыя будынкі, маюць дастатковую мажлівасьць садзейнічаць калгасам шляхам водпуску лясных матар'ялаў з сваіх фондаў, а таксама пастаноўкай пытаньня перад вышэйшымі органамі аб водпуску доўгатэрміновага крэдыту, водпуску лесу на льготных умовах на пабудову агульных, як жыльлёвых, гэтак і гаспадарчых будынкаў. Машынізацыя калектыўных гаспадарак зьяўляецца важнейшай задачай будаўніцтва калектываў. Таму ўсе нізавыя савецкія органы павінны дапамагчы дзяржаўным і каапэрацыйным арганізацыям станоўча вырашыць гэтую задачу.

Саветы павінны дапамагчы ўліць у існуючыя калектывы сьвежыя сілы з батракоў, безьзямельнай і малазямельнай беднаты і сераднякоў вёскі.

Зараз надыходзіць вясна, распачнуцца земляўпарадкавальныя работы. Неабходна каб саветы і зямельныя органы выканкомаў загадзя ўлічылі патрэбы разгарнуўшагася калгаснага руху пры практычным правядзеньні земляўпарадкаваньня. Неабходна рашуча ліквідаваць меўшыя месца зьявішчы, калі земляўпарадкавальная праца на мясцох праходзіла сама па сабе, а праца па калектывізацыі сельскіх гаспадарак сама па сабе. Земляўпарадкаваньне і калектывізацыя павінны быць шчыльна зьвязаны паміж сабою, і першае павінна быць сродкам калектывізацыі, як найлепшага віду земляўпарадкаваньня сельскае гаспадаркі.

Існуючыя калгасы ў Беларусі ў сваёй большасьці, асабліва калектывы яўрэйскіх земляробаў, жыцьцёвы, ужо маюць значныя гаспадарчыя дасягненьні, пасьпяхова ўжываюць тэхніку, машыны, трактары, сартавыя засевы, заводзяць завадзкую жывёлу і г. д. Але-ж маецца яшчэ і шмат недахопаў: напрыклад, ёсьць шмат даўно існуючых калектываў, якія да гэтага часу не земляўпарадкаваны,што зьяўляецца аднэй з галоўных прычын распаду незамацаваўшыхся калектываў. Выканкомы і саветы ў гэтай справе павінны праводзіць у земляўпарадкавальнай працы першачарговасьць для калектываў у параўнаньні з земляўпарадкаваньнем індывідуальных гаспадарак.

Пасьпяховае разьвіцьцё калгаснага будаўніцтва таксама патрабуе ад савецкіх органаў самай сур'ёзнай увагі па лініі культарна-асьветнай працы. Школы, хаты-чытальні, ленінскія куткі, радыё павінны, з дапамогай саветаў і выканкомаў, наблізіць непасрэдна сваю працу да існуючых і арганізуемых калгасаў. Неабходна праз культасьветныя ўстановы дапамагчы калгасам стаць асяродкам савецкае сельска-гаспадарчае культуры на вёсцы. Калектывы, з дапамогаю саветаў, павінны даказаць на справе сваю пераважнасьць ва ўсіх галінах перад індывідуальнымі гаспадаркамі і гэтым самым рабіць уплыў на вакольную масу сялянскіх гаспадарак. Зразумела, што для гэтага калектывам, як і саўгасам, трэба мець самую шчыльную сувязь з вакольным насельніцтвам, садзейнічаць бядняцка-серадняцкай масе перайсьці да калектыўных форм гаспадаркі.

Калгасы і саўгасы павінны быць прыкладам гаспадарчай арганізацыі, увядзеньня новай савецкай тэхнікі і падняцьця сельска-гаспадарчай вытворчасьці,аказваючы гэтым уплыў на культурна-гаспадарчае і грамадзкае жыцьцё вёскі—на падняцьце яе грамадзкага, гаспадарчага і культурнага ўзроўню. Пры дапамозе з боку саветаў і райвыканкомаў калектывы павінны ня толькі паставіць на належную вышыню арганізацыю і вядзеньне сваёй гаспадаркі, але і дапамагаць бядняцка-серадняцкай масе, шляхам дачы на пракат машын, рабочай жывёлы, у справе рамонту і пачынкі гаспадарчых прылад і арудзій, у палепшаньні пород жывёлы і насеньня на самых даступных умовах. Праз лепшыя прыклады калектыўнага вядзеньня сельскай гаспадаркі павінны стварацца ўмовы і жаданьні да пераходу ў калгасы ўсяго працоўнага сялянства.

Для таго, каб калектывы сапраўды зьявіліся месцамі разьвіцьця савецкае культуры на вёсцы, яны павінны ўзяць на сябе прыклады арганізацыі дзіцячых ясьляў, клюбаў, бібліотэк, розных курсаў, гурткоў і г. д.

Калектывы павінны быць цесна зьвязаны з усімі савецкімі і грамадзкімі арганізацыямі вёскі, асабліва з каапэрацыяй і камітэтамі сялянскай узаемадапамогі.

У справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, пашырэньня і паглыбленьня сацыялістычных элемэнтаў на вёсцы, рашучага наступленьня на кулака і нэпмана, нанова выбраныя саветы і выканкомы павінны быць арганізаваны і мабілізаваны ўсімі сіламі і сродкамі; яны павінны стаць начале гэтае справы самі і ўсямерна дапамагаць вясковай каапэрацыі, пасьпяховаму вырашэньню гэтае агульнае задачы сацыялістычнага будаўніцтва.

Сельска-гаспадарчыя камісіі пры сельсаветах павінны ажывіць сваю дзейнасьць наогул, іх праца ў галіне будаўніцтва калгасаў павінна быць першачарговай і важнейшай працай. Неабходна дабіцца, каб у працы саветаў і сельска-гаспадарчых камісій усе дырэктывы партыі і пастановы савецкаго ўраду, накіраваныя на калектывізацыю сельскае гаспадаркі, выконваліся цалкам бяз усякіх пакрыўленьняў, каб кожны селянін, жадаючы перавесьці гаспадарку на калектыўную форму, меў у савеце ня толькі патрэбны адказ, але і самае ўважлівае садзейнічаньне.

Справа калектывізацыі вёскі ёсьць справа лепшай сувязі праз каапэрацыю гораду і вёскі, сувязі паміж дзяржаўнай сацыялістычнай прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай, таму рабочыя і шэфскія арганізацыі гарадоў павінны ў сваёй працы сувязі з падшэфнымі вёскамі ўсімі сродкамі дапамагаць практычнаму ажыцьцяўленьню калгаснага будаўніцтва.

Пры ўсебаковых уважлівых адносінах да канкрэтных пытаньняў будаўніцтва калгасаў з боку партыйных і савецкіх органаў, з боку грамадзкіх і гаспадарчых арганізацый вёскі, калгасы павінны быць і будуць тым сацыялістычным сэктарам у нашай сельскай гаспадарцы, ад ягога па меры ўзросту пралетарскае дзяржавы, у меру росту сацыялістычнай прамысловасьці, будзе пашырацца сетка калгасаў і прыцягваць усё сялянства, усю сельскую гаспадарку да адзінага магутнага сацыялістычнаго арганізму. Апублікаваныя тэзісы М. І. Калініна па пытаньнях сацыялістычнага перабудаваньня вёскі павінны быць настольным каляндаром працы для ўсіх савецкіх і грамадзкіх органаў.

Партыйныя арганізацыі вёскі, сельскія і местачковыя саветы, райвыканкомы павінны выкарыстаць усе законныя сродкі, усе эканамічныя, культурныя і арганізацыйныя магчымасьці да поўнага ажыцьцяўленьня праграмы партыі па сацыялістычнаму перабудаваньню вёскі. Усе неабходныя прадпасылкі і падставы для пасьпяховага вырашэньня гэтых задач маюцца. Яны заключаюцца ў лепшым кіраўніцтве з боку партарганізацый, актыўнасьці і культурным росьце рабочых і асноўнай масы сялянства ў тым, што нашы саветы перавыбарамі адноўлены амаль на дзьве трэці за лік лепшых прадстаўнікоў партыі, рабочых, батракоў, беднаты і сярэдняга сялянства.

Усё гэта разам узятае забясьпечвае ажыцьцяўленьне лініі партыі і задач сацыялістычнага будаўніцтва на вёсцы.

В. Крывіцкі.

Гаспадарчая дапамога вясковай беднаце.

Толькі адным радыкальным шляхам магчыма вырашыць у нашых умовах праблему ліквідацыі бядняцких гаспадарак--гэта шляхам калектывізацыі вёскі. Шпаркае і шырокае будаўніцтва калгасаў выводзіць вясковую беднату з таго вельмі нізкага эканамічнага ўзроўню, на якім яна знаходзілася і знаходзіцца ў бягучым часе. У зьвязку з гэтым XV зьезд УсеКП(б) высунуў з усёй яскравасьцю ў якасьці асноўнай задачы партыі ў вёсцы для бягучага часу задачу калектывізацыі. І калі мы падыходзім да пытаньня аб гаспадарчай дапамозе беднаце, то заўсёды павінны мець перад сабою гэту ўстаноўку.

Аднак, акрамя ўцягваньня бядняцкіх гаспадарак у калектывы, дапамога беднаце вырашаецца яшчэ цэлай сыстэмай дадатковых спэцыяльных мерапрыемстваў. Асноўнай устаноўкай у гэтым выпадку зьяўляецца абарона, адмежаваньне бядняцкіх пластоў вёскі ад эксплёатацыі, узьняцьце іх палітычнай актыўнасьці і непасрэдна гаспадарчы ўздым. Іменна, выходзячы з гэтых задач, устаноўлены шэраг ільгот, якія вызваляюць беднату ад уплаты сельска-гаспадарчага падатку, ад платы за земляўпарадкаваньне. Былі дадзены спэцыяльныя ўказаньні аб утварэньні такіх умоў, якія-б забясьпечвалі шпаркае каапэраваньне і ільготнае крэдытаваньне беднаты (спэцыяльныя фонды). Акрамя гэтага, праводзіліся і праводзяцца мерапрыемствы па першачарговаму ільготнаму абслугоўваньню беднаты з боку дзяржаўных органаў і сельска-гаспадарчай каапэрацыі крэдытам, пракатнымі, насеннаачышчальнымі і злучнымі пунктамі, па лініі кантрактацыі і цэлы шэраг іншых мерапрыемстваў.

У выніку ўсіх гэтых мерапрыемстваў мы маем бясспрэчны ўздым бядняцкіх гаспадарак, а таксама і вялікія дасягненьні ў частцы аховы беднаты ад кулацкай эксплёатацыі.

Праўда, разам з усімі дасягненьнямі ў гэтай справе наглядаецца таксама і шэраг буйных і дробных недахопаў, якія заключаюцца ў няпоўным, а ў некаторых мясцох несваечасовым і неправідловым, скарыстаньні адпушчаных на гэту справу сродкаў, а таксама ў недастатковым разьмеры пазычак, кароткіх тэрмінах крэдытаваньня, існаваўшым індывідуальным паручыцельстве, недастатковым уцягненьні ў каапэрацыю і ў кіраваньне ёю бядняцкіх пластоў і г. д.

Аднак, агульнае ўражаньне ад праробленай працы за апошнія гады, і асабліва за 1927-28 гаспадарчы год, прымушае прызнаць грандыёзнасьць праробленай працы, прымушае бясспрэчна сказаць, што напрамак, узяты ў гэтай працы, праз пэўны час вырашыць цалкам праблему ліквідацыі беднаты.

Цікава зірнуць на маленькі кавалачак гэтай вялізнай працы, якая праводзіцца камуністычнай партыяй і, пад кіраўніцтвам яе, усёй савецкай грамадзкасьцю. Возьмем для гэтага і разгледзім працу, праробленую па аказаньню гаспадарчай дапамогі беднаце ў БССР.

Папярэдзе неабходна заўважыць, што, у зьвязку з адсутнасьцю поўнага спэцыяльнага падліку ў некаторых нашых ведамствах і арганізацыях, нельга даць вычэрпваючага малюнку па ўсіх мерапрыемствах. Аднак, наладжаная праца за апошні гаспадарчы год па лініі Н. К. земляробства,

Н. К. фінансаў і с.-г. каапэрацыі дае магчымасьць гаварыць аб больш буйных відах гаспадарчай дапамогі, як-та: земляўпарадкаваньні, земляпадзяленьні, крэдыце, падатковых палёгках і г. д.

Пытаньне аб земляўпарадкаваньні зьяўляецца цяпер выключна важным пытаньнем у вёсцы, бо земляўпарадкаваньне ёсьць элемэнтарная прадпасылка далейшага сур'езнага росту вытворчых сіл у вёсцы.

Канкрэтна ў справе земляўпарадкаваньня беднаты і маламоцнага серадняцкага сялянства зямельныя органы праводзілі поўную альбо частковую скідку платы за гэтую працу, якая для астатніх пластоў вёскі падлягае ўнясеньню землякарыстальнікамі ў прыбытак скарбу.

Ільготны фонд па земляўпарадкаваньню наогул быў устаноўлен на мінулы 1928 год у разьмеры 35 проц. агульнай каштоўнасьці работ. Аднак, у зьвязку з выданьнем саюзным урадам маніфэсту да X-годзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі—фонд быў значна пашыраны. І ўжо за кошт пашыранага фонду праводзілася далейшае пашырэньне ільгот за земляўпарадкаваньне. Калектыўныя гаспадаркі вызваляліся на ўсе 100 проц. ад платы за земляўпарадкаваньне; для насельніцтва мястэчак, якія земляўпарадкоўваюцца, ільготы былі даведзены да 85 проц. ад агульнай каштоўнасьці работ. Пашырэньне фонду дало магчымасьць у 1928 годзе распаўсюдзіць ільготы ня толькі на бядняцкія гаспадаркі, але і на некаторую частку маламоцных серадняцкіх.

Вынікі ўсяе гэтае работы магчыма акрэсьліць наступнымі лічбамі: за рахунак фонду скідак з дзяржаўных прыбыткаў 1927-28 году меркавалася прадставіць ільгот на суму 362.352 руб. (Гэта пры ўмовах 100-процантнага выкананьня плянавых заданьняў па ўнутрысяленным земляўпарадкаваньні і пры тэй удзельнай вазе спраў, якія выконваліся па новых таксах аплаты работ, вызначаных па бюджэту).

Аднак, плянавае заданьне па плошчы ў 495.000 га на 1927-28 год фактычна выканана ў разьмеры 358.000 га, альбо 78 проц. заданьня. Апрача гэтага, удзельная вага спраў, аплачаных насельніцтвам па новых таксах, у гэтым-жа годзе дала 75 проц., замест вымеркаваных 85 проц.

У адпаведнасьці з плошчай выкананых работ і з таксавай платай, якая спаганялася за земляўпарадкаваньне, сума ільгот павінна была зьнізіцца да 252.000 рублёў [1]).

Выкананьне заданьняў па паасобных акругах характарызуецца наступнай табліцай:

АКРУГІ	Заданьне ў тыс. рублёў	Дадзена ільгот на суму	% % выкананьня
Бабруйская	35	27835	79,4
Віцебская	30	7360	24,5
Мазырская	8	5048	63,1
Менская	34	20631	60,6
Магілеўская	54	40986	76,0
Аршанская	29	29964	103,5
Полацкая	14	9908	70,8
Гомельская	48	17060	35,6
	252	158792	63,0

[1]) Гэтая лічба і ўсе іншыя, спэцыяльна не абазначаныя у далейшым тэксьце, датычацца 1927-28 г.

Выкананьне заданьня па паасобных катэгорыях гаспадарак, атрымаўшых ільготы ў 1927-28 годзе, характарызуецца наступнай табліцай:

Катэгорыі гаспадарак, атрымаўшых ільготы	Зьнята плата: Уся — Лік гаспад.	Уся — Сума	Частка — Лік гаспад.	Частка — Сума	Разам — Лік гаспад.	Разам — Сума	% да ітогу
Калект. гаспадаркі	1198	19705 86	237	3287 07	1435	22992 93	14,5
Інваліды грамадзянск. і імпэр. вайны і асобы сац. забясьп.	334	5267 31	106	1174 61	440	6441 92	4,1
Чырвонаармейцы і кіруючы склад.	237	4121 20	177	2085 01	414	6206 21	3,9
Чырв. партызаны і чырвонагвардзейцы	64	1160 22	125	1406 07	189	2566 29	1,6
Двары, з якіх зьнят увесь с.-г. падатак	3025	45245 25	850	8980 06	3875	54225 —	34,2
Двары, якія надзяляюцца да мінімальных норм	943	13346 19	468	4625 53	1401	17971 72	11,3
Камітэты сялянск. узаемадапамогі і вуч. інш. грамадз. прызначэньня	209	4980 20	—	— —	209	4980 20	3,1
Двары, вызвален. частк. ад с.-г. падатку	609	7190 40	3486	26756 66	4095	33947 06	21,4
Двары, пацярпеўш. ад стыхійных ліхаў	362	5195 95	500	4267 04	862	9462 29	5,9
Разам . . .	6981	106212 58	5949	52582 05	12930	158794 63	100,0

Адставаньне ў выкананьні заданьня 1927-28 году тлумачыцца шэрагам прычын; галоўнай з іх зьяўляецца наяўнасьць такіх спраў, якія выкананьнем пачаты, але не даведзены да такой стадыі, калі райвыканкомы могуць канчаткова ўстанавіць і зацьвердзіць ільготы. Акруговыя зямельныя аддзелы таксама не ўдзялялі дастатковай увагі гэтай рабоце.

Адносна-жа паўнаты пададзеных зьвестак таксама трэба ўнесьці папраўку, бо некаторымі раёнамі яшчэ і да гэтага часу не прадстаўлены зьвесткі за мінулы гаспадарчы год.

Трэба адзначыць, што прадастаўлены ў бягучым годзе ільготны фонд па аплаце земляўпарадкавальных работ дае магчымасьць ахапіць ільготамі да 55 проц. усіх двароў пры земляўпарадкаваньні.

Да другога, вельмі паважнага, моманту ў галіне гаспадарчай дапамогі беднаце трэба аднесьці землянадзяленьне, якое праводзілася за апошні год як пры спрошчаным земляўпарадкаваньні, так і пры правядзеньні ўнутрысяленнага земляўпарадкаваньня. Гэтая праца праводзілася як сіламі земляўпарадкавацеляў, гэтак і сельсаветамі.

Пры земляўпарадкаваньні вёсак бядняцкім гаспадаркам прадстаўляліся ва ўсіх выпадках бліжэйшыя да сядзібы і лепшыя землі. За мінулы 1927-28 год надзелены зямлёю 5.984 безьзямельныя двары і данадзелены 46.022 малазямельныя двары. У агульным ліку гэтых двароў ёсьць 2.058 сямей чырвонаармейцаў і 312 сямей былых чырвонагвардзейцаў і партызанаў.

Па каапэраваньню бядняцкіх гаспадарак, асабліва за 27-28 г., таксама праробліна вялізная праца. Усе віды каапэрацыі, якія працуюць у вёсцы, мелі для гэтай мэты спэцыяльныя фонды. Акрамя фондаў, асобныя арганізацыі (саматужна-прамысловая каапэрацыя, камітэты ўзаемадапамогі) нават праводзілі каапэраваньне за кошт укладаньня сваіх сродкаў.

На жаль, па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі засталіся нескарыстанымі 8.780 рублёў, прызначаных на каапэраваньне па фонду. Але адначасова з нескарыстаньнем мы маем і перавышку па спажывецкай каапэрацыі, якая ў мінулым годзе скарыстала каля 50 тыс. рублёў авансам з сваіх прыбыткаў за 1927-28 год.

Агульная сума на мэты каапэраваньня беднаты па сельска-гаспадарчай, спажывецкай і саматужнай каапэрацыі складала ў мінулым годзе 361.499 рублёў, а лік бядняцкіх гаспадарак, уцягнутых у каапэратывы, уключаючы і 34.700 гаспадарак, каапэраваных за кошт сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі, складае 123.436.

Па паасобных відах каапэрацыі гаспадаркі і грошы разьмяркоўваюцца наступным чынам:

Сельска-гаспадарчая	158.700 руб,	—44.807	гаспадарак
Спажывецкая	174.900 „	—37.500	„
Саматужная	27.899 „	— 6.429	„
Камітэты ўзаемадапамогі . . .	— „	—34.700	„

У галіне крэдытаваньня беднаты па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі існуе спэцыяльны фонд. Гэты фонд у 1928 годзе складаў 1.500.400 р.

Скарыстаньне яго, па зьвестках Белсельбанку, у нізоўцы яшчэ ня поўнае. Па балянсавых матар'ялах, прыкладна, каля 200 тысяч рублёў на 1 кастрычніка 1928 году ня было скарыстана.

Парадак накіраваньня фонду крэдытнай сеткай значна палепшыўся ў параўнаньні з мінулым часам у сэнсе больш правільнага падыходу пры вызначэньні крэдыту. Сярэдні разьмер пазыкі падняўся да 80 рублёў, а процант па пазыках не перавышае $2^1/_2$ проц.

Апроч крэдытнай дапамогі беднаце за рахунак гэтага спэцыяльнага фонду, значныя сумы крэдыту накіроўваліся беднаце і з агульных сродкаў сыстэмы, аб чым сьведчыць наступная табліца:

З А Т Э Р М І Н	Роля ў крэдытах паасобных сацыяльных груп (Запазычанасьць.)		
	Беднякоў	Сераднякоў	Заможных
За 1925-26 г.	37	58,6	4,4
„ 1926-27 „	38	59,3	2,7
„ 1927-28 „	44	54,1	1,9
(арыентыров.)			

Дапамога беднаце крэдытам па лініі саматужна-прамысловай каапэрацыі праводзілася з сродкаў як самой сыстэмы, гэтак і крэдытаў Белсельбанку і бюджэтных асыгнаваньняў.

Крэдытна-прамысловыя таварыствы атрымалі для выдачы беднаце доўгатэрміновую пазыку ў разьмеры 50.000 рублёў. Грошы з гэтай пазыкі выдаваліся на гадовы тэрмін з узыманьнем ня больш 12 проц., у той час як з усёй іншай саматужнай масы бралася да 18 да 24 проц. гадавых.

Акрамя гэтай пазыкі, праз Белсельбанк была атрымана яшчэ адна спэцыяльная пазыка ў суме 50.000 рублёў для гаспадарчай дапамогі беднаце. Яна выдавалася з разрахунку ад $4^1/_2$ да 5 проц. гадавых.

Саматужна-прамысловай каапэрацыяй выдзяляліся таксама і ўласныя сродкі для крэдытаваньня беднаты. Але спэцыяльнага вучоту сыстэма не вяла, і таму нельга даць канкрэтны матар'ял.

Да гэтай-жа групы мерапрыемстваў неабходна аднесьці і працу камітэтаў сялянскай узаемадапамогі, якія праводзілі выдачу крэдыту беднаце на закупку насеньня, жывога і мёртвага інвэнтару.

Тут адзначаецца вельмі шпаркі тэмп росту асабліва за 1927-28 г. Калі ў 26-27 г. на гэтыя мэты камітэтамі ўзаемадапамогі было выдадзена 274.112 р. пры ахопе 65.632 гаспадарак, то ў наступным годзе толькі за дзьве першыя чвэрткі выдадзена ўже 301.938 руб. 73.297 гаспадаркам. Беззваротнай грашовай дапамогі беднаце камітэтамі выдадзена адпаведна за той жа час у 1926-27 годзе—16.524 рублі і за 2 чвэрткі 1927-28 г.—12.709 рублёў. Гэтая беззваротная дапамога выдавалася пры розных стыхійных бядотах, хваробе, пажарах і інш.

Пры водпуску с.-г. машын сыстэмаю дзяржгандлю (Цэнтраземсклад) бедната таксама атрымоўвала вялікую дапамогу як у сэнсе вялікай растэрміноўкі аплаты каштоўнасьці машыны, гэтак і зьніжанага, у параўнаньні з іншымі групамі, процанту за крэдыт.

З беднаты пры закупцы машын бралася ў 1927-28 годзе 5 проц. у той час, калі серадняцкія гаспадаркі павінны былі ўплачваць 8 проц. Акрамя гэтага, бедната мела магчымасьць атрымоўваць крэдыт на сумы нават ніжэй 10 руб. на закупку аднаконных плугоў, барон „зыг-заг", культыватараў, палольнікаў і асыпнікаў.

Цікава прасачыць наогул за сацыяльным складам пакупнікаў с.-г. машын па гэтай лініі (шкода толькі, што працаўнікі Цэнтраземскладу дадумаліся праводзіць вучот сацыяльнага складу толькі пачынаючы з апошняй чвэрткі 1927-28 году).

Тут мы маем наступнае:

КАТЭГОРЫІ ГАСПАДАРАК	Сума крэдыту на IV кв. 1927-28 г.		% да ітогу
Калгасы і с.-г. вытворчыя аб'яднаньні	8771	84	3,82
Індывідуальныя бядняцкія гаспадаркі	88459	41	38,55
„ серадняцк. „	125494	23	54,69
„ заможныя „	3645	78	1,59
Дзяржорганы, саўгасы і інш.	3108	26	1,35
Усяго	229479	52	100

Наша палітыка, накіраваная на ўздым вытворчых сіл дробных гаспадарак беднаты і серадняцтва, мае, апрача крэдыту, яшчэ адзін з галоўнейшых рэгулятараў—гэта кантрактацыя.

Пры правядзеньні кантрактакцыі беднаце даваўся шэраг ільгот, як-та: падвышаны аванс, першачарговае заключэньне ўмоў, здавальненьне машынамі і крэдытам, а таксама прамтаварамі.

Па зьвестках сыстэмы с.-г. каапэрацыі, у 1927-28 годзе закантрактаваныя гаспадаркі разьмяркоўваліся па асобных сацыяльных групах наступным парадкам:

Бядняцкія гаспадаркі	25.590—48	проц.
Серадняцк. „	31.200—52,3	„
Заможныя „	2.790— 4,7	„

За гэты год закантрактаваная плошча па БССР ахапіла 55.088 гэктараў.

Разьмяркоўваньне разьмеру авансу па паасобных сацыяльных групах і культурах было наступнае:

НАЗВА КУЛЬТУР	Разьмер авансу (у рублёх)		
	Бядняцкім гаспадаркам і калгасам	Серадняцкім	Заможным
Ільно-валакно	30	27	23
Ільно-семя	12	10	8
Ячмень	19	16	13
Бульба	40	35	30
Канюшына	50	50	40
Сэрадэля	35	30	25
Лубін	23	20	17

Па лініі сельска-гаспадарчага падатку і па абавязковым акладным страхаваньні праведзена таксама вялізная праца ў сэнсе дапамогі беднаце.

У 1927-28 г. вызвалена па неабкладным мінімуме прыбыткаў 61.022 гаспадаркі, або 7,7 процантаў агульнага ліку іх у БССР; поўнасьцю вызвалена ад падатку за кошт асноўнага і дадатковага (паводле маніфэсту ЦВК СССР) фонду 131.718 гаспадарак, або 16,5 процантаў. Апроч таго, часткова вызвалены ад сельска-гаспадарчага падатку 120.348 гаспадарак, або 15,1 процант усіх гаспадарак. Такім чынам, усяго ахоплена ільготамі 313.088 гаспадарак, або 39,3 процантў агульнага іх ліку па БССР. Гэтыя ільготы складаюць 1.393.208 рублёў, або 12,9 процантаў ад агульнай сумы налічанага па рэспубліцы сельска-гаспадарчага падатку.

Апроч гэтых ільгот, паводле маніфэсту ЦВК СССР, было зьнята нядоімак з 26.493 гаспадарак на агульную суму 105.677 рублёў.

Колькасьць фактычна дадзеных ільгот па абавязковаму акладному страхаваньню за 1927-28 г. відаць з наступнай табліцы, якая паказвае, хто і на якую суму быў вызвалены ад абавязковага акладнога страхаваньня.

ХТО БЫЎ АСЛАБАНЁН	Лік гаспадарак	Сума
Вайскоўцы і інваліды	26294	67643
Перасяленцы і расьсяленцы	5816	14989
Незаможныя	153391	401823
Па навальных бядотах	6289	14035
Чырвоныя партызан	3823	10325
Іншыя	3109	7118
Разам	245185	609543

У адносінах водпуску драўніны і пабочных лясных карыстаньняў у 1927-28 годзе быў устаноўлены фонд ільготнага водпуску драўніны, які складаўся з дармовага і па зьніжанай таксе водпуску—300.000 руб. і крэдытаваньня—750.000 руб.

Адпушчана ільготна драўніны і іншых лесаматар'ялаў.

	Лік гаспадарак	Кубамэтраў	На суму ў рублёх		
			Дармова	Са скідкай з таксы	У парадку крэдытаваньня
Дзелавой масы	28106	252177	219783	37875	428873
Дравяной масы	22922	100244	30552	1418	40995
Разам . . .	51028	353421	250335	39293	479868

З паказанай вышэй драўніны адпушчана па акругах[1]):

АКРУГІ	Лік сялянскіх гаспад.	Кубамэтраў	На суму ў рублёх			
			Дармова	Са скідкай з таксы	У парадку крэдытаў	Усяго
Бабруйская	9433	28300	7673	—	6309	122014
	6002	36011	43474	767	63792	
Віцебская	968	3770	975	28	1340	75321
	4204	32183	23680	5229	44069	
Гомельская	1700	7232	1406	839	2301	58571
	1658	16587	16482	8785	28759	
Менская	3913	16972	3438	—	6682	187083
	5368	66042	45121	4390	127452	
Магілеўская	1688	7018	1622	359	1847	103453
	3342	29055	34087	10742	54796	
Мазырская	1602	14521	9645	192	9339	47902
	2237	1: 652	10293	279	18154	
Аршанская	1423	7942	946	—	389	91504
	3100	19014	33337	892	55940	
Полацкая	2195	14489	4848	—	12788	73645
	2195	23633	13307	6791	35911	
Разам па БССР	22922	100244	30552	1418	40995	72965
	28106	252177	219783	37875	428873	68531
Усяго дзелавой і дравяной	51028	352421	250335	39293	469868	759496

Па пабочных карыстаньнях у лясох, як сенакашэньне і інш., забясьпечаны 6.553 гаспадаркі, пашай жывёлы—84.703 гаспадаркі, ад якіх паслося 146.174 галавы жывёлы. Усяго аказана ільгот на суму:

Дармовай . . . . . 22.215 руб.
Са скідкай . . . . . 6.891 „

На бягучы год па водпуску драўніны і пабочных карыстаньнях гэтыя ільготы бядняцкім гаспадаркам яшчэ больш пашыраны.

Што датычыцца аградапамогі, якая праводзілася як органамі НКЗема, гэтак і с.-г. кааперацыяй і сялянскімі камітэтамі ўзаемадапамогі, то канкрэтна яна выразілася ў ачыстцы насеньня, апрацоўцы глебы, рамонце інвэнтару, мерапрыемствах па жывёлагадоўлі і інш.

[1]) У лічніку паказан дравяной, у назоўніку—дзелавой лес.

Агульны лік бядняцкіх гаспадарак, ахопленых гэтым відам дапамогі, па НКЗему і с.-г. кооперацыі, складае лічбу каля 100.000. Да гэтага неабходна дадаць аградапамогу па лініі сялянскіх камітэтаў узаемадапамогі, якімі толькі за першае паўгодзьдзе 1927-28 году ахоплена 46.412 гаспадарак.

Ёсьць, акрамя гэтых відаў дапамогі, яшчэ некалькі асобных галін, па якіх таксама аказваецца гаспадарчая дапамога беднаце.

Вэтэрынарыя, перадача дзяржземмаемасьці, ахова здароўя, асьвета і інш.—Вельмі кепска, што праца праводзіцца без сталага падліку, і таму няма магчымасьці ілюстраваць гэта канкрэтным матар'ялам.

Нельга абмінуць яшчэ аднаго пытаньня, якое мае значны ўплыў на палепшаньне гаспадарчага становішча беднаты. Гэта—прадстаўленьне ёй працы па лесанарыхтоўках, па сплаву драўніны і інш.

Праца гэтая ў першую чаргу прадастаўлялася для выкананьня бядняцкім гаспадаркам, як аб'яднаным у арцелі, гэтак і адзінотным—Па прыблізны падліках заробак беднаты ў 1927-28 годзе складае каля 2 мільёнаў рублёў.

Агульны напрамак усяе дапамогі ў бок садзейнічаньня коопэраваньню і калектывізацыі і вытворчы характар дапамогі забясьпечваюць найбольшую эфэктыўнасьць гэтых мерапрыемстваў.

Да справы гаспадарчай дапамогі беднаце неабходна прыцягнуць усе грамадзкія арганізацыі вёскі, ад актыўнасьці якіх вельмі многа залежыць.

Дапамога пралетарскае дзяржавы разам з дапамогаю на мясцох, якая павінна быць арганізавана вясковай грамадзкасьцю пад кіраўніцтвам парт'ячэек, дасьць магчымасьць беднаце хутчэй ажыцьцявіць вытворчую перабудову сваіх гаспадарак.

ОТДЕЛ II.

ЭКОНОМИЧЕСКОЕ СТРОИТЕЛЬСТВО.

Р. П. Рак.

Да пытаньняў кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці БССР.

I.

Статыстычныя органы ўсю прамысловасьць падзяляюць на дзьве часткі: а) буйную прамысловасьць альбо цэнзавую і б) усе астатнія віды. У склад апошняе групы ўваходзяць па форме эксплёатацыі: дзяржаўная, каапэрацыйная і прыватная прамысловасьці. Прыватная-ж у сваю чаргу падзяляецца на прыватную з наёмнай працай (дробная прамысловасьць), прыватную без наёмнай працы (кустарна-рамесьніцкая прамысловасьць). Кустарная прамысловасьць--таварная вытворчасьць; рамесьніцкая калі праца адбываецца на заказчыка. Увес гэты сэктар прамысловасьці ўмоўна завуць „дробная і кустарна-рамесьніцкая прамысловасьць“. Гэтае азначэньне для ўжываньня ў нашых беларускіх умовах ня зусім прыгодна, дзякуючы таму, што яно робіць ня зусім выразнай сутнасьць гэтае прамысловасьці. У нас гэты сэктар у абсалютнай большасьці мае характар рамёстваў, а пагэтаму самы падыходзячы тэрмін для данага сэктару быў-бы „рамесьніцкая прамысловасьць“ альбо „рамёствы“. Гэтае азначэньне, хоць і не зьяўляецца універсальным, але затое яно яскрава высоўвае характар гэтае прамысловасьці. Аднак-жа, прымаючы пад увагу шырокае ўжываньне тэрміну „кустарна-рамесьніцкая[1]) прамысловасьць“, мы ў далейшым будзем ужываць, маючы на ўвазе зробленую вышэй агаворку, апошні тэрмін для таго, каб ухіліцца магчымых непаразуменьняў.

Звычайна прынята думаць, што ў нас кустарна-рамесьніцкая прамысловасьць мае невялікае пашырэньне. Гэта тлумачыцца тым, што да апошняга часу ня было дакладных дадзеных аб яе пашырэньні, а тыя весткі, якія меліся, зусім не адпавядалі сапраўднасьці. Дадзеныя-ж апошніх гадоў паказваюць, што ў нас гэтая галіна народнае гаспадаркі пашырана ня менш, чым у РСФСР, Украіне і Закаўказьзі. Па вестках Саюзнай Статыстычнай Управы („Мелкая и кустарно-ремесленная промышленность СССР в 1925 г.“, стр. XIV) мае наступныя лічбы:

НАЗВА РЭСПУБЛІК	На 10.000 насельніцтва прыходзіцца кустароў і рамесьн.	Процантныя адносіны насельніцтва, абхопленага досьледам, да ўсяго насельніцтва
Па ўсяму Саюзу	172	89,0
„ РСФСР	170	80,0
„ УССР	152	96,8
„ ЗСФСР	156	66,7
„ БССР	107	91,2

Прыведзеныя лічбы гавораць зусім не за нас. БССР у гэтай табліцы стаіць на апошнім месцы. Але ў сапраўднасьці справа абстаіць крыху ня

[1]) Тэрмін „саматужнік“, якім перакладаецца тэрмін „кустарь“, па нашай думцы, павінен быць зусім адкінуты, таму што ён не адпавядае сутнасьці таго ўяўленьня, якое ўкладаецца ў тэрмін „кустарь“.

так. У досьледах 1925 г., мусіць, была дапушчана нейкая памылка, дзякуючы якой быў зроблен значны недавучот. Даныя агульнага вучоту 1926 г., які праводзіўся адначасова з дэмаграфічным перапісам, ужо даюць трохі іншы малюнак. Тут ужо мы маем на 10.000 насельніцтва 162 кустары і рамесьнікі. Пасьля 1926 г. высьветлілася, што і ў час вучоту 1926 г. па Беларусі зноў быў зроблен недавучот, пры чым гэты недавучот складае 20 проц. агульнага ліку кустароў і рамесьнікаў. Такім чынам, па апошнім дадзеным Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы Беларусі, мы маем ужо на 10.000 жыхароў да 200 кустароў і рамесьнікаў. Лічба, як бачым, досыць высокая. Зразумела, што яна не зьяўляецца максымальнай, бо ў РСФСР ёсьць і такія раёны, як Вяцкая губ., дзе на 10.000 насельніцтва прыходзіцца 500 кустароў і рамесьнікаў, альбо Архангельская губ., дзе мы маем на той-жа самы лік 754, але яна з пэўнасьцю паказвае, што ў сэнсе лікавага пашырэньня кустароў і рамесьнікаў Беларусь наогул ня ўступае вышэйазначаным рэспублікам. У абсалютных-жа лічбах па Беларусі мы маем у разглядаемым намі сэктары прамысловасьці па апошніх дадзеных Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы БССР 100.725[1]) асоб, якія выкідваюць на рынак на 188.453.399 руб. рознае прадукцыі. Лічбы прыведзены за 1926-27 г. у той час, як цэнзавая прамысловасьць за гэты год дала прадукцыі на 127.555.383 руб. без акцызу. У гэты падлік не ўвайшлі хатнія рамёствы, якія па Беларусі маюць вялікае пашырэньне, як прыклад, у народным ткацтве па самых мінімальных падліках занята да 700.000 асоб.

Разам з гэтым ня лішнім будзе прывесьці і лічбы, якія характарызуюць удзельную вагу паасобных галін нашае гаспадаркі адносна ўсяе гаспадаркі СССР[2]). З гэтых лічбаў відаць, што;

	1925-26 г.	1926-27 г.	1927-28 г.
	У процантах		
1. Удзельная вага валавой прадукцыі с.-г. (у цэнах 1926-27 г. бяз лесу, рыбалоўства і паляваньня) складае	4,6	4,3	4,6
2. Удзельная вага валавой прадукцыі цэнзавай прамысловасьці (у цэнах 1926-27 г.)	1,1	1,1	1,3
3. Удзельная вага валавой прадукцыі дробнае (няцэнзавае) прамысловасьці (уключ. сыравіну заказаў па цэнах 1926-27 г.)	5,1	4,3	4,6

Лічбы вельмі паважныя. Сваёю сутнасьцю яны як бы сыгналізуюць аб тым, што іх увесь час трэба трымаць ў полі зроку і зварочваць на іх максымум увагі. Для таго, кыб паказаць, ці зварочваецца ў нас на Беларусі належная ўвага на кустарна-рамесьніцкую прамысловасьць, мы прыводзім шэраг дадзеных, якія характарызуюць адносіны да данае справы, напрыклад ў РСФСР.

II.

У РСФСР дасьледваньнем кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці займаюцца наступныя ўстановы: Інстытут эканамічных дасьледваньняў, Інстытут эканомікі і сельскае гаспадаркі пры Ціміразеўскай Акадэміі, Усекапрамсаюз, ВСНГ РСФСР з шэрагам падпарадкаваных яму ўстаноў і інш. З пералічаных устаноў асабліва вялікую ўвагу гэтай справе аддае ВСНГ РСФСР у асобе Цэнтральнай Навуковай вопытна-паказальнай станцыі па кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці. Даная станцыя зьяўляецца вытворча-дасьледчай і вопытна-паказальнай установай, якая

---

[1]) Глядзі „Савецкае Будаўніцтва“ № 1 за 1929 г. ст. 46.

[2]) Глядзі „Кантрольныя лічбы пяцігад. пляну разьвіцьця народнае гаспадаркі і культуры БССР“—„Савецкая Беларусь“ ад 17-II—29 г., № 38).

мае сваёю мэтаю садзейнічаньне падняцьцю тэхнікі кустарных промыслаў і рамёстваў, палепшаньню якасьці і зьніжэньню сабекошту фабрыкатаў кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці шляхам а) дасьледваньня вытворча-тэхнічнага і эканамічнага становішча промыслаў і рамёстваў, б) выпрацоўкі спосабаў прымяненьня навейшых дасягненьняў навукі і тэхнікі ў кустарна-рамесьніцкай вытворчасьці, в) самастойных навукова-тэхнічных дасьледваньняў і інш.

Станцыя падзяляецца на наступныя аддзелы: 1) эканамічны, 2) тэхна-хімічны, 3) мэхана-электра-тэхнічны, 4) мастацка-прамысловы і 5) музэйна-выставачны. Акрамя гэтага станцыя мае навукова-тэхнічную бібліотэку, лябараторыі, майстэрні, музэй узораў кустарных рэчаў вытворчасьц, якія могуць быць прыкладам у адносінах тэхнікі і мастацкасьці, якасьці і кошту, а таксама выстаўку машын, станкоў, інструмэнтаў, неабходных для кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці. Пры станцыі маецца раз'яздны тэхнічны інструктаж. Усе ўстановы станцыі досыць шырока разгарнулі сваю працу. Доказам гэтага можа зьяўляцца тое, што к даннаму моманту станцыя мае 5 лябараторый-майстэрняў і акрамя цэнтральнага магазыну шэраг аддзяленьняў апошняга па Маскве. Лябараторыі-мастэрні маюць характар курсаў, куды выклікаюцца больш здатныя кустары і рамесьнікі, дзе ў працягу 1—$1^1/_2$ мес. яны знаёмяцца з новымі дасягненьнямі ў тэхніцы свайго промыслу і з новымі прыёмамі вытворчасьці. Пры азнаямленьні са станцыяй мімаволі кідаецца ў вочы шырокі размах яе працы. За адносна кароткі тэрмін працы—каля 2 гадоў—яна ўжо мае значныя дасягненьні, асабліва ў вынаходзтве стойкіх фарбаў для афарбоўкі аўчын, скурак зайцаў, сусьлікаў, кошак і інш. у чорны і цынамонавы-буры колеры. Знойдзен шэраг неядавітых і танных фарбаў для цацак, выпрацаваны просты спосаб прапітваньня сялянскага палатна вадаўпартым саставам (сурагат брэзэнту), знойдзен спосаб атрыманьня ваціну для падкладі без машыны і шмат іншых рэцэптаў, якія састаўлены, праверaны і пушчаны ёю ў жыцьцё. Пры сучасным тэмпе працы станцыя ўжо ў бліжэйшыя гады зможа адыграць вялікую ролю ў жыцьці рамесьніцкае прамысловасьці. Бюджэт станцыі ў 1928-29 г. складае 128.576 р.

Ня менш сур'ёзную ўвагу зварочвае ВСНГ РСФР і на падрыхтоўку кваліфікаванае рабочае сілы непасрэдна для данага сэктару прамысловасьці. У 1928 г. у веданьні ВСНГ РСФСР былі наступныя вучэбна-паказальныя ўстановы па кустарна-рамесьніцкай прамысловасьпі: тэхнікумаў 4, інструктарскіх школ 12, вучэбна-паказальных майстэрняў 8, леса-хімічных вучэбна-паказальных майстрэрняў 10, прафэсійна-тэхнічных устаноў па кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці, якія знаходзяцца ў веданьні прафобраў СНГ і атрымліваюць датацыю ад ВСНГ, 101. Акрамя гэтага ў 1927-28 г. было адчынена ВЦИК РСФСР новых вучэбна паказальных устаноў па кустарнай прамысловасьці 23.[1])

Ня можам абыйсьці моўчкі і такую ўстанову, як кустарная сэкцыя пры навукова-тэхнічным бюро расейска-нямецкага таварыства „Культура и техника". Сэкцыя ў мэтах набліжэньня замежнае тэхнікі к савецкаму кустару і рамесьніку арганізавала бюро тэхнічнае консультацыі, якое абслугоўваецца лепшымі нямецкімі і савецкімі спэцыялістымі і дае зусім бясплатна даведкі, рэцэпты, парады па любой галіне кустарнае прамысловасьці. Яна-ж выдае і часопіс „Техника кустарю и ремесленнику", які мае аддзелы: а) расейская і замежная тэхніка кустару і рамесьніку ў сучасных гаспадарчых умовах, б) навіны замежнае тэхнікі, в) тэхнічныя парады, г) навіны і замыслы і д) абмен вопытам.

---

[1]) Глядзі часопіс „Кустарю и Ремесленнику", за 1928 г.

Падагульваючы дадзены разьдзел артыкулу, мы павінны канстатаваць, што ў РСФСР у сэнсе дасьледваньня кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці, у сэнсе падрыхтоўкі кваліфікаванае сілы і, наогул, пытаньням па даннай галіне народнае гаспадаркі адводзіцца досыць пачэснае месца. Зразумела, мы ня можам сьцьвярджаць што ў РСФСР у гэтым сэнсе ўжо дасягнулі ідэалу. Робіцца шмат, патрэбна рабіць яшчэ больш. Аб гэтым сьведчаць артыкулы, якія зьмешчаны ў часопісах „Плановое хозяйство“, выданьне Дзяржпляну і „Техника кустарю и ремесленнику“, дзе ў шэрагу эканамічных п«таньняў, з аднаго боку, асабліва востра ставіцца пытаньне падрыхтоўкі кваліфікаванае сілы і ў шэрагу такіх навучальна-паказальных устаноў, як тэхнікумы для падрыхтоўкі тэхнікаў і інструктароў, кустарна-рамесьніцкія школы для падрыхтоўкі кваліфікаваных кустароў і майстроў і вучэбна-паказальныя майстэрні для падрыхтоўкі кваліфікаваных кустароў і рамесьнікаў; узьнімаецца пытаньне аб арганізацыі спэцыяльных вячэрніх школ для падняцьця тэхнічнай сьвядомасьці кустароў і рамесьнікаў, так сказаць, на хаду, не адрываючы іх ад штодзённай працы, і, з другога боку, адзначаецца недастатковасьць усіх гэтых мерапрыемстваў, каб падняць кустарна-рамесьніцкую прамысловасьць на належную вышыню. Адначасна з гэтым узьнімаецца пытаньне аб патрэбе арганізацыі навукова-вытворчага інстытуту, які-б выпрацоўваў прыёмы ці спосабы і стандарты на кустарныя вырабы падобна нямецкаму інстытуту па ўдасканаленьню рамесьніцкае вытворчасьці ў горадзе Карлсруэ. Увогуле на справу дасьледваньня кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці і на падрыхтоўку рабочае сілы па данай галіне у РСФСР на 1928-29 г. асыгнавана 3.125.419 р., што на аднаго кустара і рамесьніка дае 1,6 руб.

III.

Бяручы нашы беларускія ўмовы, канечна, мы ня можам прэтэндаваць на той досыць вялікі размах працы ў справе дасьледваньня і арганізацыі кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці, які маецца ў РСФСР, але ўсё-ж мы ў праве чакаць, што і мы ў данай галіне не адстаём ад РСФСР. У нас дасьледваньнем рамёстваў займаюцца камісія для вывучэньня рамёстваў Акадэміі Навук і Беларускі кустарна-прмысловы саюз. Але цяпер, калі паглядзім, як разгорнута гэтая праца, дык пабачым наступнае: камісія для вывучэньня рамёстваў пры Акадэміі Навук пры наліччы $^1/_2$ штатнай адзінкі і надзвычайна мізэрнага бюджэту на дасьледчую працу (500 р. у 1927- 28 г. і 600 р. у 1928-29 г.), зразумела, пры ўсім сваім жаданьні ня можа разгарнуць свае досьледы ў патрэбным маштабе. Камісія складаецца амаль выключна з аматараў гэтае справы, якія аддаюцца ёй патолькі, паколькі гэта дазваляе бюджэт часу па асноўнай працы. І ўсё-ж, ня гледзячы на такія нязвычайныя ўмовы, камісія за кароткі час свайго існаваньня мае ўжо дасягненьні ў сэнсе картаграфаваньня рамёстваў і промыслаў, дасьледваньня народнага ткацтва, арганізацыі мастацкага аддзелу пры Белкустпрамсаюзе і інш.

Беларускі кустарна-прамысловы саюз заняты амаль выключна штодзённай працай у сэнсе арганізацыі новых арцеляў, арганізацыі працы ў самых арцелях і збытавымі апэрацыямі. Такім чынам, для паглыбленага дасьледваньня кустароў і рамесьнікаў—для дасьледваньня іх сыравіннай базы, тэхнікі, мажлівасьці арганізацыі новых промыслаў і рамёстваў, вывучэньня пытаньняў рабочай сілы і наогул эканомікі ў Белкустпрамсаюза няма мажлівасьці, і ён гэтымі справамі амаль не займаецца.

Акрамя пералічаных устаноў, да справы вывучэньня кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці мае дачыненьне Навукова-дасьледчы інстытут імя

Леніна, які толькі пачынае займацца справай вывучэньня, і Вышэйшы савет народнай гаспадаркі Беларусі. У складзе апошняга ёсьць аддзел дробнай і кустарнай прамысловасьці. Па аналёгіі з ВСНГ РСФСР мы павінны чакаць, што і ВСНГ Беларусі ў тым ці іншым выглядзе (шаблён, канечна, не абавязковы) аддае справе кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці належную увагу.

Сапраўднасьць сьведчыць не на карысьць нашага ВСНГ. Ніякіх дасьледчых устаноў па вывучэньню гэтае прамысловасьці, падпарадкаваных яму, няма, і наогул навукова-дасьледчая праца ВСНГБ у гэтай галіне не вядзецца. Таксама нічога ня робіцца і ў сэнсе падрыхтоўкі кваліфікаванае сілы для кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці. ВСНГБ у сваім веданьні ня мае ніводнае навучальнае ўстановы, якая бы рыхтавала спэцыялістых для данага сэктару прамысловасьці. Справай падрыхтоўкі кваліфікаванай сілы для кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці ў Беларусі займаецца прафобр. Наколькі разгорнута прафобрам гэтая справа, сьведчыць ужо адно тое, што да апошняга моманту няма яшчэ зацьверджанага пяцігадовага пляну працы па данай галіне. Для Наркамасьветы і прафобру гэта справа зьяўляецца чамусьці мусіць ня яснай, бо інакш не мажліва растлумачыць, чаму гэта Наркамасьветы ў сваім пляне падрыхтоўкі спэцыялістых (глядзі газэту „Савецкая Беларусь № 20 ад 7/II—29 г.) зусім не прадбачыць падрыхтоўкі такіх для кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці. Апошняе вынікае з таго, што Наркамасьветы мусіць ня лічыць гэту працу сваёй справай. Такая сапраўднасьць. Справа-ж падрыхтоўкі рабочае сілы і спэцыялістых для кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці пакуль-што зусім кульгае. У сэнсе папулярызацыі розных мерапрыемстваў па палепшаньню тэхнікі кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці ў нас таксама амаль нічога ня робіцца. Выдаваць часопіс тыпу „Техника кустарю и ремесленнику“ мы ня можам, але арганізіваць аддзел пытаньняў кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці, хоць у часопісе „Плуг“ ці газэце „Беларуская вёска“, мы павінны.

IV.

На кустарна-рамесьніцкую прамысловасьць у шырокіх колах, ня толькі абыватальскіх, а нават і кіруючых гаспадарчым жыцьцём дзяржавы, няма дастаткова вытрыманага погляду. Існуюць дзьве крайнасьці: адна крайнасьць зьяўляецца ў пераацэнцы кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці, у „рамантыцы“ гэтае прамысловасьці, якая бывае мяжуецца з народніцтвам; другая крайнасьць адваротнага парадку—недаацэнка, якая лічыць, што для кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці ніколі і ні пры якіх умовах ня будзе месца. Ёсьць і такія, якія нашу кустарна-рамесьніцкую прамысловасьць ацэньваюць, як фактар „самабытнасьці“. Зразумела, ніякай самабытнасьці ў гэтым няма, а ёсьць толькі адзнака адсталасьці нашае эканомікі. Але адгэтуль зусім ня трэба рабіць вываду, што ў дзяржавах з высокай тэхнікай промыслы і рамёствы цалкам уступілі сваё месца буйнай прамысловасьці. Калі мы возьмем такую дзяржаву, як Злучаныя Штаты, дзе асабліва высока разьвіта тэхніка, дык у 1900 г. з 512.000 [1]) прамысловых устаноў было 305.000 майстэрняў, дзе праца адбывалася ўручную і дзе працавала 600.000 асоб з агульнага ліку ў 5.306.000 рабочых. З 1900 г. у Злучаных Штатах дробныя майстэрні не падлічваюцца, але пры гэтым у 1914 г. з 275.791 прамысловай установы без наёмнай сілы

[1]) Лічбы аб дробнай прамысловасьці Злучаных Штатаў і Нямеччыны ўзяты з кніжкі М. Нахимсона „Мировое хозяйство“, т. I, і А. М. Гинзбурга „Экономика промышленности“, ч. I.

было 11,9 проц., з лікам наёмных рабочых ад 1 да 5—51,1 проц., ад 5 да 20 рабочых—19,7 проц., г. зн. 82 проц. усіх устаноў адносяцца да групы ніжэй нашае цэнзавае (16 рабочых з рухавіком і 30 без рухавіка) і ў гэтай групе прамысловасьці звыш 900.000 рабочых з агульнага ліку ў 7000.000.

У Нямеччыне дробная і кустарна-рамесьніцкая вытворчасьць займае яшчэ больш моцнае месца. Лік гаспадароў-кустароў і рамесьнікаў—у 1861 г. складаў 1 млн., у 1895 г.—1,3 міл. і ў 1907 г.—1,6 міл. (нажаль больш позьніх дадзеных няма). Там, як вядома, рэформісты, грунтуючыся на абсалютным росьце ліку дробных устаноў, пыталіся адмаўляць канцэнтрацыю капіталу. Прыведзеныя лічбы досыць яскрава сьведчаць аб тым, што адначасова з індустрыялізацыяй дзяржавы павялічваецца і лік дробна-рамесьніцкіх устаноў. І нават такі наватар у сэнсе рацыяналізацыі тэхнікі, як Гэнры Форд, побач з сваімі заводамі-гігантамі, будуе для вырабу рознай дробязі маленькія заводзікі знарок кустарна-рамесьніцкага тыпу [1]).

Зразумела, што ўдзельная вага кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці ў балянсе народнай гаспадаркі з разьвіцьцём тэхнікі зьніжаецца.

V.

Дробная і кустарна-рамесьніцкая прамысловасьць, як відаць з папярэдняга, нават у такіх капіталістычных дзяржавах, як Злучаныя Штаты і Нямеччына, ужываецца побач з буйнай прамысловасьцю. Падобнае-ж зьявішча мы назіраем і ў нас. Побач з узростам буйнай прамысловасьці адбываўся і ўзрост кустарна-рамесьніцкае. Па вылічэньнях праф. А. А. Рыбнікава [2]), у даваенны час (тэрмін для досьледу быў узяты з 80-х г. да 1912 г.) адбываўся няўхільны прырост як буйных, так і дробных прамыслоўцаў. Першыя ў сярэднім кожны год давалі прырост 4,8 проц., а апошнія—2,6 проц. Прырост буйных прамыслоўцаў крыху абганяў прырост дробных, але лік занятых асоб у кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці шмат перавышаў лік асоб, занятых у буйнай. У гэтым сэнсе досыць цікавай зьяўляецца табліца, якую прыводзіць праф. А. А. Рыбнікаў [2]) з якой відаць, што за апошнія перадваенныя гады на 1000 душ усяго насельніцтва ў Нямеччыне, Францыі і Расеі прыходзілася:

	У Нямеччыне 1917 г.	У Францыі 1906 г.	У Расеі 1908-12 г.
У дробнай прамысловасьці	94	66	30
У буйнай „	136	97	16
	230	163	46

К данаму моманту ў СССР гэтыя суадносіны значна зьмяніліся, але і цяпер мы маем перавагу на баку кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці. Па вестках ЦСУ СССР у 1925-26 г. у кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці было занята каля 3.000 000 рабочых у той час, як у цэнзавай 2,4 проц. Зусім другі малюнак будзе, калі ўзяць удзельную вагу кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці ў агульнай прадукцыі ўсяе прамысловасьці. Па кантрольных лічбах Дзяржпляну СССР доля дробнай і кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці падае: у 1923-24 г. яна складае 24 проц., у 1924-25 г.—20,8 проц., у 1925-26 г.—17,2 проц., а ў 1926-27 г.—16,4 проц. Па больш позьніх падліках ВСНГ Саюзу (гл. Вытворчы плян на 1926-27 г.)

---

[1]) Гл. арт. Г. Красіна у часопісе „Техника кустарю и ремесленнику“, № 4, за 1927 г.

[2]) „Экономическое Обозрение“ за 1927 г., № 7.

гэтая доля яшчэ памяншаецца і складае ў 1924-25 г.—18 проц., у 1925-26 г.—16 проц., у 1926-27 г.—15 проц. (усе гэтыя разьлікі ўзяты без мукамольля).

Апошнія лічбы могуць прывесьці да думкі, што раз буйная прамысловасьць мае тэндэнцыю выціскаць кустарна-рамесьніцкую, дык паміж аднэй і другой існуюць супярэчнасьці, існуе працілегласьць інтарэсаў. Такая думка будзе, бязумоўна, неправідловай. Ці можна пярэчыць супроць відавочнага і агульна вядомага факту, што ўсякая расьліна імкнецца да сонца і пагэтаму заўсёды расьце ўверх? Ясна—не. Але што з гэтага бясспрэчнага факта выцякае? Ці можна з яго, напрыклад, зрабіць такі вывад, што корань, які цягне ў працілеглы ад сонца і сьвету бок і расьце заўсёды ўніз, супярэчыць (мяшае) натуральнаму узросту расьліны? Канечна, не [1]). Ці можна адмаўляць, што рост і разьвіцьцё прамысловасьці абавязкова вядзе да пераважаньня буйнай машыннай фабрычнай вытворчасьці над дробнай ручной кустарна-рамесьніцкай? Канечна, не.

Быць можа ў канцы-канцоў, у больш-менш далёкім будучым, ня толькі пераважнай, але адзінай пануючай формай вытворчасьці будзе агромністая цэнтральная фабрыка, якая к таму часу праглыне ўсе дробныя. Усё будзе індустрыялізавана.

Мажліва, гэта наступіць хутчэй, чым думаюць. Але ці выходзіць з гэтага, што гэтай канцэнтрацыі прамысловасьці ў далёкім будучым супярэчыць усякая дробная і кустарна-рамесьніцкая прамысловасьць у данны час, і што яе трэба лічыць шкоднай, якая заслугоўвае ўціску, скарачэньня і працівадзеяньняў? Гэта было-б таксама недарэчна, як падрэзаць карэньні ў расьліны.

Лёзунг індустрыялізацыі не выключае машынізацыі кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці, а, наадварот, уключае ў сваю праграму садзейнічаньне ўсякаму ўвядзеньню машыннай тэхнікі ў кустарна-рамесьніцкай вытворчасьці. Паміж буйнай прамысловасьцю і кустарна рамесьніцкай няма супярэчнасьці, а галоўнае, няма працілегласьці інтарэсаў. Яны хутчэй ўзаемна кормяць адна другую паўфабрыкатамі і сыравінай, якія зьяўляюцца для абедзьвюх падмогаю і даюць глебу для існаваньня.

Зусім ня лішнім будзе напомніць і аб тым, што гаворыць пра кустарна-рамесьніцкую прамысловасьць камуністычная партыя. Пастанова XIV партканфэрэнцыі кажа: „Кустарная промышленность и промыслы имеют и будут иметь еще долгое время чрезвычайно важное значение в общей экономике Союза Советских Республик. Развитие кустарной промышленности и промыслов, обслуживающих внутренний (крестьянский и городской) рынок, с одной стороны, содействует государственной крупной промышленности путем выработки и обработки полуфабрикатов, а с другой стороны, является средством использования избыточной рабочей силы деревни и в некоторых районах главным источником доходов крестьянства. В силу этого внимание партии и государства должно быть в большей мере, чем до сих пор, направлено на вопросы кустарной промышленности и кооперирования кустарей и промышленников“.

Гэтае пытаньне знайшло месца і ў праграме камуністычнае партыі, дзе гаворыцца наступнае: „По отношению к мелкой и кустарной промышленности необходимо широкое использование ее путем дачи государственных заказов кустарям; включение мелкой и кустарной промышленности в общий план снабжения сырьем и топливом, а также ее финансовая поддержка при условии об'единения отдельных кустарей, кустарных артелей, производительных кооперативов и мелких предприятий в более крупные

[1]) Гл. час. „Техника кустарю и ремесленнику“, № 8 за 1926 г., арт. С. Л.

производственные и промышленные единицы; поощрение кустарных об'-единений путем предоставления им экономических преимуществ, направленных, на ряду с другими мерами к тому, чтобы парализовать стремление кустарей превратиться в мелких промышленников и создать безболезненный переход этих отсталых форм производства к более высокой крупной машинизированной индустрии".

Надзвычайную яснасьць і дакладнасьць у адносінах да кустарнай прамысловасьці ўносіць пастанова СНК СССР ад 3/V 27 г., „Фабрично-заводская промышленность еще долго не может удовлетворить своей продукцией всей потребности деревни в товарах, а также поглотить избыточную рабочую силу. Кустарно-ремесленная промышленность использует избыточную рабочую силу преимущественно бедняцко-середняцких слоев деревни и в значительной мере удовлетворяет потребительский спрос крестьянского и городского рынка. Этим определяется ее громадное значение в народном хозяйстве СССР. До настоящего времени центральные и местные органы и особенно органы, ведающие госпромышленностью, не дооценивали значения кустарно-ремесленной промышленности в экономике Союза ССР и не оказывали в должной мере содействия ее развитию. В целях изучения кустарно-ремесленной промышленности и, в частности, промысловой кооперации и более тесной увязки ее работы с работой госпромышленности и перспективами развития народного хозяйства предложить ЦСУ СССР, ВСНГ СССР, Госплану СССР и СНК союзных республик обеспечить постановку учета и планирования кустарной промышленности и промысловой кооперации с включением их в перспективный 5-летний и ежегодные планы промышленности".

Прыведзеныя пастановы надзвычайна яскрава вызначаюць ролю кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці ў гаспадарчым жыцьці дзяржавы і тыя мерапрыемствы, якія патрэбны для яе ўзмацненьня і разьвіцьця. Дырэктывы просты і ясны, але адносіны да іх гаспадарчых органаў, як гэта відаць з папярэдняга, ня ўсюды адналькovыя. У час штодзённае працы пры разгортваньні буйнай прамысловасьці, неяк забываюць пра існаваньне кустарна-рамесьніцкае, а бываюць і такія выпадкі, калі пастаноўку пытаньняў кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці лічаць бадай што недарэчнасьцю. Падобныя зьявы, зразумела, ня могуць садзейнічаць разьвіцьцю кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці. Ня зусім нармальныя адносіны да данае галіны прамысловасьці і ў прыватнасьці да прамысловай каапэрацыі зьявіліся падставаю для таго, што СНК СССР ад 21/V-28 г. выдаў спэцыяльную пастанову, дзе пастаўлены ўсе кропкі над „і", дзе ня толькі дадзены дырэктывы, а і пералічаны конкрэтныя мерапрыемствы для яе адраджэньня.

VI.

Гаворачы пра кустарна-рамесьніцкую прамысловасьць, мы ня можам абыйсьці моўчкі пытаньняў каапэраваньня, бо вялікі лік мерапрыемстваў ня могуць знайсьці належнага месца, пакуль кустары і рамесьнікі будуць распылены, пакуль яны будуць працаваць індывідуальна. У гэтым напрамку лічбы, якія даюць ЦСУБ і Белкустпрамсаюз, ня могуць нас задаволіць, хоць аб'ектыўна гэтыя лічбы досыць высокія. У кніжцы „Промышленность БССР—итоги и перспективы" выданьне ВСНГБ 1928 г. на стр. 125 мы маем такое месца: „Общее число кооперированных кустарей по БССР 32%. Калі-жа мы паглядзім па сутнасьці, што гэтыя лічбы з сябе выяўляюць, дык убачым, што яны распадаюцца на дзьве часткі: першая, значна меньшая вытворчыя аб'яднаньні, і другая—крэдытныя таварыствы. Больш выразнай,—і больш пажаданай, зразумела, зьяўляецца першая група, якая аб'яднала на першае кастрычніка 1928 г. 10.957 асоб, альбо каля 10%

ад агульнага ліку кустароў і рамесьнікаў. З 1927 г. гэта група ўзрасла ў два разы, але 10% усё-ж лік малы. Другая група зьяўляецца, хоць і значна большай за першую, але надзвычайна нявыразная, бо па даных ЦСУБ (Гл. „Промышленность БССР—итоги и перспективы“, стр. 124), яна завецца „Товарищества кредитные“, а Белкустпрамсаюз заве іх прамыслова-крэдытнымі таварыствамі, а ў вогуле нешта ня зусім выразнае. Гэтыя таварыствы, бывае, аб‘яднаюць сваіх сяброў для збыту прадукцыі, закупкі сыравіны, а то і проста для розных фінансавых апэрацый, бывае, зусім нязьвязаных з кустарна-рамесьніцкай дзейнасьцю. Пагэтаму да данай групы з агульнай меркай падыходзіць нельга, і арцелі—вытворчыя адзінкі аб‘яднаць з крэдытнымі таварыствамі досыць рызыкоўна, бо такая групоўка можа прывесьці да такіх вывадаў, якія ніякай сапраўднасьці ня могуць адпавядаць.

Адначасна з гэтым нас цікавіць і справа аграмаджанага сэктару гэтае галіны прамысловасьці. У гэтым напрамку асаблівых дасягненьняў мы ня маем. У кніжцы „Мелкая кустарно-ремесленная промышленность СССР“ на стр. 148 мы маем табліцу разьмеркаваньня рамёстваў па формах эксплёатацыі па БССР у 1925 г.

	Усяго	Дзяржаўных	Каапэраваных	Прыватных
а) лік вытворчых адзінак . . .	28779	199	182	28398
б) у іх занятых асоб	31832	629	572	33634
в) адзіночак	24651	44	55	24552
г) з наёмнай працай	1808	199	106	1503
д) у іх наёмных рабоч. і служач.	3219	626	304	2289
% па БССР вытворчых адзінак.	100	0,6	0,6	98,8
“ “ СССР “ “	100	0,6	3,4	96,0

У табліцу не ўвайшло мукамольле. Табліца вельмі цікавая. У 1925 г. аграмаджаны сэктар складаў толькі 1,2% кустарна-рамесьніцкіх устаноў. Праўда, пасьля 1925 г. ужо адбыліся значныя зьмены. У 1928 г. мы ўжо маем па агульнаму сэктару - няцэнзавая прамысловасьць—наступныя лічбы.

	Па форме эксплёатацыі у % % да агульнага ліку занятых асоб
Дзяржаўныя	3,5
Паацкалектывы . . .	1,7
Каапэрацыйныя . . .	5,0
Прыватныя	89,8

Лічбы ўзяты з кніжкі „Промышленность БССР—итоги и перспективы“. Калі з гэтых груповак выкінуць дробную прамысловасьць, дык процант аграмаджанага сэктару значна зьнізіцца і, па нашых меркаваньнях, будзе каля 6—7. Процант аграмаджанага сэктару ў параўнаньні з 1925 г. павялічыўся, але ён усё-ж вельмі малы. У гэтым сэнсе работы непачаты край. На гэту справу трэба зьвярнуць максымум увагі.

Разам з пытаньнямі падняцьця вытворчасьці буйнае прамысловасьці, з падняцьцем ураджайнасьці мы павінны паставіць і пытаньне павышэньня вытворчасьці працы ў кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці. Трэба мець на ўвазе, што наша кустарна-рамесьніцкая прамысловасьць пры самай прымітыунай тэхніцы ў 1926-27 г. выкінула на рынак прадукцыі на 127.555.383 рублёў. Павышэньне на 30—50% вытворчасьці працы

якое павінна быць пастаўлена, як задача, на бліжэйшае пяцігодзьдзе, дасьць павялічэньне на дзесяткі мільёнаў народнага прыбытку. Мы павінны паставіць, як практычную задачу, арганізацыю новых падсобных промыслаў у вёсцы для таго, каб выкарыстаць вагромністыя натуральныя багацьці, якія знаходзяцца навакола вёскі, і адкіды вясковай гаспадаркі, якія цяпер гінуць бяз усякае карысьці. Гэта дасьць заробак дзесяткам тысяч сялянскіх і местачковых рабочых рук. Але бяз тэхнічнае і фінансавае дапамогі гэтай справы ўперад не пасунуць. У гэтым напрамку трэба разьвіць найвялікшую энэргію. Дзяржава ў асобе ВСНГБ і прамкаалэрацыя павінны сур'езную ўвагу зьвярнуць на тэхнічную дапамогу кустаром і рамесьнікам. Да данае справы мажліва трэба прыцягнуць і шырокія колы грамадзкасьці. Пры агульнай напружанасьці толькі мажліва машынізацыя рамёстваў, але гэта павінна папярэдзіць масавае арганізаванае ўцягненьне кустароў і рамесьнікаў у прамкаапэрацыю. Разьвіцьцё-ж прамкаапэрацыяй машыннай індустрыі раскідае ўсе, так сказаць, „ідэолёгічныя" заўвагі супроць кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці, дзякуючы таму, што межы паміж дзяржаўнай прамыславасьцю і прамкаапэрацыяй паступова будуць сьцірацца. Непатрэбна забываць і на словы Леніна ў арт. аб каапэрацыі і каапэрацыйных установах: „При нашем существующем строе предприятия кооперативные отличаются от предприятий частно-капиталистических, как предприятия коллективные, но не отличаются от предприятий социалистических, если они основаны на земле при средствах производства, принадлежащих государству, т. е. рабочему классу".

VII.

У кантрольных лічбах пяцігодкі (глядзі Савецкая Беларусь ад 19/II-29 г. № 39) досыць востра ставіцца пытаньне аб праблеме працы. Там мы маем наступныя радкі:

„Як усім вядома, самым вялікім рэзэрвам для беспрацоўя зьяўляецца у нас вёска, таму асноўная наша задача—рассасваньня беспрацоўя і лішку рабочых рук у самай сельскай гаспадарцы, гэта значыць—арганізацыяй ў ёй працаёмкіх работ, як меліорацыя, торпараспрацоўкі і г. д. і інтэнсыфікацыяй с.-г. разгортваньня працаёмкіх культур. Гэта ўсё будзе ўбіраць працоўныя рукі ў самай с.-г. вытворчасьці. „Па нашай думцы гэта яшчэ ня ўсё. Для больш пасьпяховае індустрыялізацыі патрэбна скарыстоўваньне ўсіх працоўных рук і ня толькі ўлетку, а і ўзімку. Гэтыя рукі можна з посьпехам заняць у кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці, для чаго трэба ўзмацніць мерапрыемствы, як па разьвіцьцю існуючых рамёстваў, так і па арганізацыі новых. У гэтым напрамку асабліва сур'ёзную ўвагу мы павінны зьвярнуць на калектыўныя гаспадаркі, як на тыя гнезды, дзе павінны ўзьнікнуць новыя рамествы і промыслы.

Што мы бачым цяпер у калгасах? Калектыўная праца адбываецца летам. Зімою-ж амаль кожны сябра калгасу жыве зусім індывідуальна. Навыкі калектыўнае працы, дзякуючы апошняму, а таксама і амаль поўнай бязьдзейнасьці губляюцца. На гэтай глебе часьцей за ўсё сустракаюцца і розныя непаразуменьні, якія у выніку прыводзяць бывае да распаду аб'яднаньня. Калі ж зарганізаваць у калгасе які небудзь промысел, дык на глебе сумеснае працы ў працягу ўсяго году калектыўныя навыкі будуць замацоўвацца пры правідловай арганізацыі вытворчасьці атрымаюцца вольныя сродкі, якія мажліва будзе перакінуць у гаспадарку, ад чаго яна хутчэй акрэпне і зьявіцца прыкладам для другіх. У нашых умовах мажліва арганізаваць наступныя рамествы і промыслы: 1) цагельны для вырабу розных сартоў цэглы; 2) чарапічна-кафельны асабліва у зьвязку з агнятрывалым будаўніцтвам; 3) ганчарны; 4) кавальскі; 5) рамонтныя майстэрні;

6) смалакурна дзягцярны; 7) па вырабу гонтаў, клёпкі і драніц; 8) пляценьня з лазы, арэшніку, дубу, наогул з лучыны розных кошыкаў, кашовак, карзін, мэблі і інш.; 9) па вырабу каробак, сіт, рашот, лапат і рознага начыньня; 10) бандарна-бачарны; 11) па вырабу колаў, абадоў, сьпіц, палазоў, аглабель, дуг, клешчаў, тапарышчаў, ложак, абручоў і інш; 12) па вырабу мэблі; 13) такарны; 14) па апрацоўцы саломы—пляценьня саламяных стужак, капялюшаў, вульлёў для пчол, рознай пасуды і інш ; 15) крухмальны; 16) патачны; 17) мармяладны; 18) валёначна-лямцовы; 19) грабянёвы і 20) ткацкі па вырабу самых розных рэчаў, пачынаючы ад палавікоў, мяшкоў, рушнікоў, фіранок, розных сартоў палатна, абрусаў, наметаў, хустак, коўдраў, дыванаў і канчаючы паясамі.

Мы ня маем на мэце пералічыць усе мажлівыя віды рамёстваў і прамыслаў. Іх ёсьць многа. Кожны промысел ці рамяство патрабуе ў кожным выпадку спэцыяльных умоў для свайго разьвіцьця, а пагэтаму наперад зазначыць, дзе і якое рамяство можа быць пашырана, немажліва. Для пасьпяхоўнага разьвіцьця т. го ці іншага рамяства у першую чаргу патрэбна усебаковае вывучэньне сыравіны раёну, як асноўнай базы рамяства, пры наліччы якой толькі і мажліва распачынаць працу па арганізацыі.

Вывады.

У выніку вышэйадзначанага мы павінны канстатаваць:

1. У сэнсе разьвіцьця кустарнае прамысловасьці БССР ня ўступае іншым саюзным рэспублікам.

2. Дасьледваньне гэтае галіны народнае гаспадаркі ў нас знаходзіцца не на належнай вышыні. Гаспадарчыя органы БССР мала зварочваюць увагі на справу дасьледваньня кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці.

3. Слабы рост аграмаджанага сэктару гэтае галіны прамысловасьці:

Усё гэтае ў бліжэйшы час вымагае шэрагу наступных мерапрыемстваў.

1. Усе органы, якія маюць дачыненьне да кустарна-рамесьніцкае прамысловасьці, павінны зьвярнуць максімум увагі на данную справу.

2. Патрэбна павялічэньне сродкаў на ўсебаковае вывучэньне промыслаў і рамёстваў, бо толькі на падставе грунтоўнага вывучэньня і мажліва разгортваньне тэй ці іншай працы.

3. Правядзеньне шэрагу мерапрыемстваў для ўзмацненьня росту аграмаджанага сэктару кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці.

4. Арганізацыя падрыхтоўкі рабочае сілы шляхам адчыненьня школ, курсаў, арганізацыі вячэрніх заняткаў спэцыяльна для кустароў і рамесьнікаў.

5. Узняць пытаньне наконт арганізацыі дасьледчай станцыі з шэрагам курсаў-майстэрняў.

6) Арганізацыя тэхнічнае дапамогі кустаром і рамесьнікам.

7. Паставіць на чаргу дня пытаньне аб арганізацыі новых рамёстваў, асабліва ў зьвязку з сучасным заняпадам мястэчак і з пашыраным ростам калгаснага будаўніцтва, у мэтах скарыстаньня ў вольны ад працы на гаспадарцы час вольных рук.

8. Папулярызацыя мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў мэтах палепшаньня і разьвіцьця кустарна-рамесьніцкай прамысловасьці.

С. Мышалов.

О текучести рабочей силы в промышленности.

Текучесть рабочей силы в нашей промышленности следует рассматривать в качестве одной из серьезных и вместе с тем до сего времени не разрешенных проблем. Несмотря на то чрезвычайно важное значение, которое она имеет для промышленности, она, к сожалению, до сего времени остается не проработанной и почти не затронутой в литературе проблемой. В частности, нет еще даже единой более или менее определенной методологии исчисления размера текучести. Характерно, что вопросом текучести рабочего состава заинтересовались сравнительно недавно и за границей, в результате чего и там до настоящего времени еще нет достаточного статистического материала, который сколько-нибудь удовлетворительно осветил бы этот вопрос. В то же время, судя по материалам научного бюро НКТ СССР, усиленная текучесть рабочего состава имеет место и в английской, и в американской, и в немецкой промышленности. Но если за границей изучение этого вопроса пока еще поставлено не на должную высоту, если в Союзе ССР он еще недостаточно проработан, то у нас в Белоруссии, насколько нам известно, этот вопрос вовсе не освещался. Между тем актуальность постановки этого вопроса совершенно очевидна.

В периоде реконструкции промышленности и рационализации производства проблема текучести приобретает особо важное значение. Для осуществления задач в области рациональной организации труда в производстве необходимо не только полное и целесообразное использование материально-технической базы предприятий, но также не в меньшей степени правильная организация труда, экономное и наилучшее использование живого человеческого материала—рабочей силы. Последнее, однако, не всегда дооценивается нашими хозяйственниками, в результате чего мы являемся свидетелями явно отрицательных явлений, выражающихся в усиленном и чрезмерно большом обороте рабочей силы в промышленности.

Текучесть рабочей силы есть узел, в котором скрещивается ряд отрицательных моментов в работе промышленности, влекущих за собой нежелательные экономические и политические последствия. С одной стороны, она неизбежно приводит к понижению трудовой дисциплины, понижению производительности труда, росту травматизма и т. д. Систематическое обновление рабочего состава создает возможность просачиванию в промышленность недисциплинированных и необученных элементов (зачастую в неорганизованном порядке). Вновь пришедшему рабочему приходится терять определенное время на приспособление к работе в новой обстановке, и он, естественно, в первый период работы, как правило, не дает необходимого производственного эффекта. Неприспособленность к непривычному оборудованию, инструменту и т. д. влечет за собой увеличение случаев заболеваний, увечий и т. п.

С другой стороны, текучесть является одной из причин, способствующих сохранению (а иногда и росту) безработицы среди членов профсоюзов, так как в число вновь принимаемых на работу попадает значительное количество не членов союзов, особенно в предприятиях, расположенных в не окружных центрах, что в результате в известной степени влияет также на текучесть состава профессиональных организаций. И,

наконец, нельзя не отметить, что текучесть, способствующая просачиванию крестьянских элементов на фабрики и заводы, создает опасность известного разжижения рабочего состава. Это уже является крупным политическим фактором, ибо приобрести подлинные пролетарские навыки и закалку могут лишь рабочие, долго работавшие в производстве. Именно эти кадры являются основной базой для нашей партии, за счет которых она пополняет свои ряды, черпает новые, свежие силы. Таким образом, в свете вышеуказанных предпосылок задача по устранению вышеотмеченных отрицательных факторов приобретает огромное значение и требует к себе усиленного внимания как со стороны хозяйственников, так и профсоюзов и органов труда.

Об обороте рабочей силы у нас в цензовой фабрично-заводской промышленности говорят следующие цифры, рисующие положение вещей за последние два года (данные сектора труда ЦСУ БССР):

ГОДЫ	Средне-годовое число рабочих	Прибыло	Убыло	В %% к ср.-г. числу	
		Абсолютн.	Абсолютн.	Принято	Уволено
1926/27	27828	29954	29301	107,6	105,3
1927/28	30835	31626	27818	102,5	90,2

В то время, когда за 1927-28 год средне-годовое число рабочих в промышленности увеличилось на 3.007 человек (10,8 проц.), за этот год было вновь принято 31.626 чел., или 102,5 проц. всего состава рабочих, а уволено 27.818 чел., или 90,2 проц. Такое же приблизительно соотношение было и в 1926-27 году.

По отдельным отраслям промышленности оборот рабочей силы неодинаковый; это видно из нижеприводимых цифр, характеризующих оборот за 1927-28 год:

ГРУППЫ ПРОИЗВОДСТВА	Средне-годовое число рабочих	Прибыло	Убыло	В %%% к ср.-г. числу	
		Абсолютн.	Абсолютн.	Принято	Уволено
Стекольное	3128	5584	4485	178,5	143,4
Деревообраб.	5199	7747	7513	149,0	144,5
Спичечное	3608	4451	4030	123,3	111,7
Пищевое	2471	2353	2323	95,2	94,0
Полиграфическое	1207	1228	1239	101,7	102,6
Металлообраб.	3209	1767	1459	55,1	45,5
Бумажное	3032	1353	1417	44,6	46,7
Льняное	2341	314	592	13,4	25,3

Как видно, по большинству групп производства и прием и увольнение достигают 100 и выше процентов по отношению к средне-годовой численности рабочих; исключением является лишь льняная промышленность, дающая более пониженный оборот—13,4 проц. в приеме и 25,3 проц. в увольнении. Интересны также цифры, характеризующие оборот рабочей силы по отдельным предприятиям разных отраслей промышленности:

НАИМЕНОВАНИЕ ПРЕДПРИЯТИЙ	Средне-годовое число рабочих	Прибыло	Убыло	В %%% к ср.-г. числу	
		Абсолютн.	Абсолютн.	Принято	Уволено
Спич. ф-ка „Кр. Березина“	964	1065	1073	110,5	111,3
Стеклозавод им. Домбаля	567	959	1199	169,1	211,4
Писчебумажн. ф-ка „Герой труда“	1433	1331	1334	92,9	93,1
Завод сельхоз. машин и орудий № 3 „Красный металлист“	803	627	483	78,1	60,1
Льно-прядильная ф-ка „Двина“	1782	349	254	19,6	14,1

Таков оборот рабочей силы в нашей промышленности. Цифры этого оборота, как видно, чрезвычайно солидны. По ряду отраслей промышленности наши предприятия представляют собой буквально проходной двор, через который, почти не задерживаясь, движутся две встречные волны рабочей массы. Как это отражается на производстве, говорить излишне.

Такова внешняя сторона этого вопроса. Какова должна быть, однако, наша оценка текучести рабочего состава? Если исходить из предпосылки, что оборот рабочей силы идет организованным порядком, сознательно кем то регулируется, направляется в сторону подбора желательного состава рабочих, тогда, пожалуй, можно было бы спорить о том, является ли это положительным или отрицательным явлением. Но при том положении, когда процесс оборота происходит стихийно, совершенно неорганизованно, можно безошибочно сказать, что текучесть рабочей силы сильно бьет по интересам производства и не способствует созданию нормальной обстановки на предприятии.

Говоря о текучести, нельзя пройти мимо довольно важного вопроса — о составе „оборачиваемых", характере их работы, и каковы основные причины текучести. Эти вопросы приобретают особый интерес, ибо большой разницей является: затрагивает ли оборот рабочей силы основной кадр рабочих, коренным образом меняя его, или же оборот происходит, главным образом, за счет временных работ, не затрагивая основного массива рабочей силы предприятий. К сожалению, следует признать, что прямых указаний о характере оборота (временные и постоянные работы) у нас не имеется. Однако, косвенные данные говорят за то, что оборот касается преимущественно временной рабочей силы. За это говорят данные бирж труда о характере предложения труда и посылки на работу.

